PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/

№ 42 (2371) Год XLVI | Беласток 21 кастрычніка 2001 г. | Цана 1,50 зл.

Поспехі нашых калег на фестывалі фільмаў.

Беластоцкае тэлебачанне ўзнагароджанае

Мікола Ваўранюк

Фільм Яўгена Шпакоўскага „Стасек” атрымаў трэцюю ўзнагароду на V Міжнародным фестывалі этнічных фільмаў і тэлеперадач „У сябе” ў Кракаве. А Беластоцкі аддзел Польскага тэлебачання, які прадстаўлялі яшчэ стужкі Юркі Каліны і Лешка Валосюка „Чарнобыльцы” ды аўтара гэтага допісу „Помнікаманія”, быў адзначаны спецыяльнай узнагародай *за прысланне фільмаў, якія вылучаліся жывым зацікаўленнем праблемамі меншасцей, свежым аўтарскім поглядам і высокай якасцю.*

Кракаўскі фестываль стаў найважнейшым форумам у Польшчы і заўважальным у свеце, дзе вядзецца гаворка пра этнічныя справы, дзе праблемы меншасцей паказаны ў мастацкі спосаб. *Мы ад пачатку хацелі, каб наш Фестываль, дзякуючы конкурсу, навуковым канферэнцыям і журналісцкім курсам, быў месцам задумы над роляй медыяў, асабліва публічнага тэлебачання, у вырашанні этнічных праблемаў*, — кажа Вальдэмар Янда, стваральнік і нязменны дырэктар фестывалю. — *Верылі мы, што страх і неталерантнасць бяруцца з недахопу ведаў пра іншых, іх жыццё, гісторыю, рэлігію і культуру. Мы думалі, што фільмы і тэлеперадачы дадуць большай колькасці гледачоў веды пра меншасці і этнічныя групы, а за гэтым пойдзе талерантнасць, а можа і акцэптацыя.*

Ці так сталася? — дырэктар Янда далёкі ад чыноўніцкага аптымізму. Але ўжо тое, што на працягу пяці гадоў на фестываль публічныя тэлевізіі, як і прыватныя прадзюсеры з сарака краін (з усіх кантынентаў) прыслалі амаль 400 дакументальных фільмаў, рэпартажаў і перадач, застаўляе схіліць галовы з пашанай для арганізацыйнага пачыну групы людзей з Кракава.

Сёлета на фестываль былі прысланы 70 фільмаў, з якіх на конкурс былі дапушчаны 26. Журы пад старшынствам вядомага дакументаліста Анджэя Фідыка найлепшым прызнала стужку Марціна Мамоня і Мар’юша Пліса „Цана праўды”. Гэта гісторыя чэшскай ваеннай карэспандэнткі Пэтры Прахаскавай, якая пад уплывам трагедыі Чачні кінула сваю прафесію і заснавала ў Грозным дзіцячы дом. Другую ўзнагароду ўзяла балгарка Адэля Пеева за фільм „Непатрэбныя” пра прымусовую балгарызацыю туркаў у 1980-я гады.

Герой фільма Яўгена Шпакоўскага — мастак-аматар з Гайнаўкі Станіслаў Жывалеўскі — сваім жыццём даказвае,

[працяг ☞ 2]

З дакладам пра ўклад беларусаў у польскую культуру выступіў прафесар Адам Мальдзіс. За сталом (злева): Цэзары Карпінскі і Аляксандр Баршчэўскі. Насупраць дакладчыка: Анатоль Грыцкевіч.

„Шлях да ўзаемнасці” — канферэнцый пад такою шыльдай сама менш дзве. Арганізатары кожнай з іх даказваюць, што яны, а не другі бок, ладзяць адзінаслушную імпрэзу. Пасля скаргі Галоўнага праўлення БГКТ ва ўрад Беларусі гэты апошні нават забараніў Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта праводзіць у Беларусі канферэнцыю з такою назвай...

Падвойная канферэнцыя

Аляксей Мароз

IX Міжнародная навуковая канферэнцыя „Шлях да ўзаемнасці”, якая з 5 па 7 кастрычніка праходзіла ў Белавежы, была арганізавана многімі міжнароднымі ўстановамі: Кафедрай беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, Польскім беларусазнаўчым таварыствам, Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў у Мінску, Польскім інстытутам у Мінску, Беларускай бібліятэкай імя Францыска Скарыны ў Лондане і Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Канферэнцыя ў гэтым годзе была арганізавана ўжо другі раз. Першая яе частка праходзіла ў Беларусі.

— У першапачатковых планах нашага супрацоўніцтва з Цэнтрам імя Францыска Скарыны ў Мінску рашылі мы арганізаваць канферэнцыю „Шлях да ўзаемнасці” наперамен у Польшчы і Беларусі. Якраз у гэтым годзе канферэнцыя мела быць у Беларусі. У сувязі з тым, што кіраўніцтва Беларускага грамадска-культурнага таварыства заявіла ў Беларусь, што мы нелегальна арганізуем канферэнцыю, якая ім належыцца, Дзяржаўны камітэт па справах нацыянальных меншасцей і рэлігій забараніў нам праводзіць у Мінску канферэнцыю пад назовам „Шлях да ўзаемнасці”. У такім выпадку мы правялі ў Мінску ў чэрвені гэтага года канферэнцыю пад змененым названнем — „Праз навуку да праўды”. Але, каб не здавацца поўнасцю, мы працягваем ладзіць нашу канферэнцыю „Шлях да ўзаемнасці” і арганізуем дзевяты яе выпуск у Белавежы. Канферэнцыю не запачаткаваў ніхто іншы толькі я і мною было прыдумана яе названне. У наступным годзе або ў Беларусі, або ў Польшчы правядзем юбілейны дзесяты выпуск „Шляху да ўзаемнасці”, — заявіў галоўны арганізатар канферэнцыі, загадчык Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

Канферэнцыю адкрылі прадстаўнікі белавежскіх улад. Войт гміны Станіслаў Куявяк паінфармаваў пра турыстычныя козыры Белавежы і Белавежскай пушчы ды расказаў пра інвестыцыі ў гміне. Сказаў і пра цяжкасці — у гміне нізкія заробкі, уцякае адсюль моладзь. Намеснік старасты Гайнаўскага павета Ежы Сірак гаварыў пра шматкультурнасць, шматрэлігійнасць і шматнацыянальнасць Гайнаўшчыны, а арганізатар канферэнцыі, прафесар Аляксандр Баршчэўскі, паведаміў, што мерапрыемства адбываецца дзякуючы Польскаму інстытуту ў Мінску. Дырэктар Інстытута, Цэзары Карпінскі, удзельнічаў у канферэнцыі як ганаровы госць і расказаў пра дзейнасць палякаў у Мінску.

У гэтым годзе ў Белавежу прыехала многа дакладчыкаў з Беларусі. Хаця

[працяг ☞ 2]

Самаабароны праўда аб Польшчы ☞ 3

Пра адносіны Самаабароны да беларускай меншасці. Анджэй Лепэр адказаў наступным чынам: — Станоўчыя! Лукашэнка ў тым што робіць у Беларусі, у большасці мае рацыю. Не ўпускае злачынцаў з Захаду і добра робіць. Не прадае ім беларускай зямлі, у адрозненні ад тых нашых. Аб тым, што там бяда, мы ведаем. Але сапраўды мы станоўча ставімся да беларускай, рускай, украінскай, нават і яўрэйскай меншасцей.

Пасол з Гаркавічаў ☞ 4

У лютым 1927 г. найвышэйшыя дзяржаўныя ўлады вырашылі ліквідаваць Грамаду. Валошын быў сярод 56-ці арыштаваных дзеячаў партыі. Пастановай суда Валошын быў прыгавораны да 12 гадоў турмы. Вызвалілі яго ў 1932 г. У выніку абмену палітычнымі вязнямі апынуўся ў Савецкім Саюзе.

Пра парфуму ☞ 5

У нашай фірме была нават астралагічная табліца, пры дапамозе якой мы прапанавалі кліенткам выбіраць сабе адпаведныя пахі. Аднак жа толькі палова кліентак звяртала на гэту табліцу ўвагу.

Асенні зялёны ліст ☞ 8

Гэта так ёсць на вёсцы... — раптам засумаваў Янка Карповіч, адзін з тых, хто пачынаў з „Асеннім лістом”. — Быў час, калі бацькі, дзеці і дзяды былі разам. Гэта будавала пашану да старэйшых, да роднага. А цяпер дзед застанецца ў вёсцы забітай дошкамі, нікому непатрэбнай, бацькі б’юцца як рыба аб лёд, каб хлеб дастаць, а дзеці па вуліцы ходзяць. І ані мовы, ані культуры не будзе.

... адкуль мой род ☞ 9

Бабця мая выхавана была ў глыбока каталіцкай радзіне. Так моцна глыбокай, што ўжо змоладу „абрыдлі” ёй каталіцкія духоўнікі. Нават перад смерцю, прымушаная шпітальнымі лекарамі і ксяндзом да згоды на аперацыю, ледзь падымаючыся на схуднелых руках, пакрыквала: „Не будзеце вы мне казаць, што ў маім сэрцы няма Бога. Не ўлазьце паміж нас!”

Два гады ў баўэра ☞ 10

У баўэра, апрача жонкі і дачкі, працаваў наёмны работнік, паляк Зыгмунт. Я прыехаў у час сенакосаў. Якраз сена з поля прывезлі. Гаспадар панямецку штосьці загаварыў да мяне, але я зразумеў два словы „польныш” і „русіш”. Мне здавалася, што пытаў ён, хто я такі. „Рускі”, — адказаў я яму.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Беларусам не хапае волі да свабоды

Такое меркаванне вядомы беларускі літаратар Уладзімір Арлоў выказаў падчас прэзентацыі сваёй новай кнігі гістарычнай прозы „Сон імператара" ў мінскай Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы.

Адказваючы на пытанні, пісьменнік адзначыў, што для яго самым прынцыповым момантам падчас прэзідэнцкіх выбараў стала акцыя на Кастрычніцкай плошчы Мінска вечарам 9 верасня. „У сталіцы ў мінулым былі акцыі апазіцыі, у якіх часам удзельнічалі да 50 тысяч чалавек. Аднак у такі адказны дзень на плошчы сабраліся ўсяго некалькі тысяч", — сказаў Арлоў.

Паводле яго слоў, спробы некаторых апраўдаць непагодай сваю адсутнасць на Кастрычніцкай плошчы выглядаюць недарэчнымі. „Спасылкі на дождж тых, хто адносіць сябе да дэмакратычнай апазіцыі, толькі пацвярджаюць той факт, што мы яшчэ не дараслі да перамогі", — падкрэсліў пісьменнік.

Уладзімір Арлоў лічыць, што сёння справа нацыянальнага адраджэння шмат у чым залежыць ад сітуацыі ў сям'і. „Ад таго, якія імёны мы даем дзецям, на якой мове з імі размаўляем, якія казкі ім чытаем, як ставімся да беларускіх святаў і традыцый, залежыць будучыня новага пакалення, а значыць і краіны", — лічыць пісьменнік.

Марат Гаравы

Народная Воля, № 191 ад 10.10.2001

Ці спыняць крыжы вандалаў?

Тое што неабходна пашыраць Мінскую кальцавую дарогу ні ў кога не выклікала сумніву. Але хто мог падумаць, што пад шум будаўнічай тэхнікі нашчадкі сталінскіх катаў захочуць знішчыць помнік злачынстваў іх дзядоў — Курапаты.

Пасля абрання першага прэзідэнта Беларусі, шматпакутныя Курапаты не раз былі ахвярай набегаў вандалаў. Магілы расстраляных выкопваліся, косткі раскідваліся па наваколлі. Пасля неаднаразовых спробаў урэшце быў знішчаны памятны знак, падараваны прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам. Ганьбаваўся і асвечаны святарамі ўсіх асноўных канфесій Беларусі крыж. Аднак Курапаты заставаліся сімвалам злачынства камуністычнай ідэалогіі. І вось знайшлі выхад.

Паводле праекта адзін з участкаў пашыранай кальцавой дарогі павінен прайсці праз Курапаты. Але ўлады забыліся, што жывуць яшчэ на гэтай зямлі беларусы. Сотні абураных мінчукоў кінуліся ратаваць мемарыял. Ужо некалькі тыдняў людзі прыносяць і ўсталёўваюць у Курапатах крыжы. Упарадкоўваюць магілы. А галоўнае — сваімі целамі закрываюць іх ад бульдозераў. Моладзь не разыходзіцца нават ночу, бо добра ведае: кадэбэшнікі па начах не толькі забівалі людзей, але і знішчалі помнікі беларускага народа. Супраціў мінчукоў прывёў да часовага прыпынення будаўнічых працаў. Археолагі павінны высветліць, ці ёсць на шляху дарогі, што будуецца, магілы, у якіх захаваліся астанкі памардаваных. Калі косткі пакутнікаў не будуць знойдзены, бульдозеры зноў заравуць у курапацкім лесе. Сучасным вандалам няма справы, што ўся зямля Курапатаў прасякнута чалавечай крывёй.

Зміцер Кісель

Фота: http://www.svaboda.com/

Беларусі даюць крэдыт

Як паведамілі інфармацыйныя агенцтвы, 26 верасня ў Вашынгтоне падпісана пагадненне аб выдзяленні Беларусі пазыкі Сусветнага банка ў памеры 22,6 мільёна долараў ЗША.

Крэдыт даецца на шаснаццаць з паловай гадоў з адтэрміноўкай выплаты асноўнай сумы на чатыры з паловай гады. На момант падпісання дакумента працэнтная стаўка па крэдыце складала 7% гадавых. Атрыманыя грошы павінны быць накіраваны на рэканструкцыю сістэм ацяплення, цеплаізаляцыі і асвятлення прыкладна ў 500 школах, бальніцах і дзіцячых садках.

Трэба адзначыць, што гэта першая пазыка Сусветнага банка Беларусі пасля 1994 года.

Юлія Цярэнцьева

Газета Слонімская № 40, 4-10.10.2001

Час пераносіць сталіцу ў Магілёў

Аляксандр Лукашэнка сфармаваў свой новы ўрад. Такое адчуванне, што выбары патрэбны яму былі менавіта для гэтага. Ні ў знешняй, ні ва ўнутранай палітыцы зменаў не прадбачваецца. Выбары не прызнае цывілізаваны свет. Але ў самой Беларусі ён па-ранейшаму цар і бог. Проста з'явілася падстава трошачкі паднавіць урад.

Па ўсім відаць, што давярае Лукашэнка толькі сваім землякам і расіянам. Нават ахову сваёй асобы ён даручыў былому палкоўніку фінансавай міліцыі Яўгену Дзвярніцкаму, які родам са Шклова. Прэм'ер-міністрам стаў магіляўчанін Генадзь Навіцкі. Наогул ураджэнцы Прыдняпроўя (ці не самай адсталай эканамічна і культурна, найбольш русіфікаванай часткі Беларусі) будуць кіраваць сельскай гаспадаркай, прамысловасцю, мытняй, гаспадарчым судом, „Беларусьбанкам" і статыстыкай. Па сваёй ментальнасці яны напэўна знойдуць агульную мову з расіянамі, якія ўзначалілі адміністрацыю прэзідэнта, міністэрства ўнутраных спраў і камітэт дзяржаўнай бяспекі. Што да двух апошніх, дык увачавідкі Лукашэнка баіцца даверыць рэпрэсіўны апарат беларусам, хай сабе нават магіляўчанам. А раптам у іх прачнецца нацыянальнае пачуццё і яны не згодзяцца, у выпадку чаго, ваяваць супраць свайго народа. Цень Мілошавіча, відаць, сніцца Лукашэнку.

Зміцер Кісель

І хочацца, і колецца

Гродзенская абласная пракуратура ніяк не можа знайсці больш-менш прыстойных падстаў для закрыцця газеты „Пагоня". За сваю прынцыповую пазіцыю падчас кампаніі па выбарах прэзідэнта краіны выданне атрымала ад улад „падзяку" ў выглядзе абвінавачання ў парушэнні заканадаўства па друку і ў абразе прэзідэнта. За апошняе прадугледжваецца крымінальная адказнасць.

На шчасце гэтая справа пакуль „заглухла". А вось Вышэйшы гаспадарчы суд краіны не можа вырашыць, што рабіць з непаслухмянай газетай. Прававых падстаў быццам бы няма. Нават Дзяржаўны камітэт па друку не ўгледзеў юрыдычных асноў для закрыцця „Пагоні". Але „наверсе" камусьці хочацца, каб адзіная рэгіянальная беларускамоўная газета перастала існаваць. Судовы працэс пачаўся яшчэ 27 верасня. Аднак быў перанесены на 5 кастрычніка. Але і ў гэты дзень суддзя Валеры Жандараў не пажадаў быць крайнім і перанёс разбор справы на 23 кастрычніка „дзеля правільнага і ўсебаковага высвятлення абставін".

— Пракурор хоча закрыць газету, але не мае падстаў, — кажа галоўны рэдактар „Пагоні" Мікола Маркевіч. — А я хачу, каб яна працягвала выходзіць і маю на гэта ўсе падставы.

Зміцер Кісель

Беластоцкае тэлебачанне ўзнагароджанае

[1 ☞ працяг]

што мастацтва можа жыць усюды, неабавязкова ў вялікіх цэнтрах. Асабліва, калі арыентуецца на выдатныя крыніцы. У гэтым выпадку — на ікону. „Чарнобыльцы" Юркі Каліны і Лешка Валосюка, якія вясной былі адзначаны першай узнагародай у конкурсе Асацыяцыі рэгіянальных тэлевізій (*CIRCOM Regional*), гэта гісторыя людзей, якім заваліўся добра вядомы свет. Мая „Помнікаманія" расказвае, як у мястэчку Свіслач сталі заварочваць час — напрыканцы 2000 года паставілі помнік Сталіну. Гэтыя тры стужкі запрацавалі на асобную, высокую ацэнку Беластоцкага тэлебачання ў Кракаве.

Дарэчы, у апошні час у некалькіх іншых месцах таксама заўважылі наш лакальны тэлецэнтр. Яраслаў Нікіцюк атрымаў узнагароду міністра сельскай гаспадаркі за фільм „Хаця б я" пра Яна Рожка — гаспадара з-пад Любліна, лідэра сялянскіх пратэстаў у 80-я гады. На фестывалі экалагічных фільмаў у Райгродзе Юры Каліна атрымаў дзве галоўныя ўзнагароды, за „Чарнобыльцаў" і „Ад памору і голаду", у якім расказвае пра феномен народных лекарак — шаптух. На гэтым жа фестывалі вылучэнне атрымала перадача „Magazyn ekologiczny" Юзафа Вежбы. На жаль, перадача не выходзіць у эфір ужо больш года. І гэта як быццам сімвалічна паказвае становішча Беластоцкага тэлебачання. Калі ўсё большы прафесіяналізм людзей, калі з'яўляюцца ўзнагароды і пахвалы, няма за што рабіць новыя фільмы і праграмы. Квадратура кола.

Мікола Ваўранюк

Падвойная канферэнцыя

[1 ☞ працяг]

канферэнцыя датычыла польска-беларускага памежжа, то яе ўдзельнікі засяродзіліся, у галоўным, на беларускай літаратуры, беларускай мове і яе дыялектах. У першы дзень закраналіся культурныя, публіцыстычныя, палітычныя і гістарычныя тэмы. З дакладамі выступілі прафесар Адам Мальдзіс з Мінска, які гаварыў пра ўклад беларусаў і Беларусі ў польскую культуру і прафесар Сяргей Габрусевіч з Гродна, які пры нагодзе свайго даклада пра фундаментальныя каштоўнасці беларускай і польскай культур, адклікаўся яшчэ да прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Звярнуў ён увагу на вялікую падтрымку ў Беларусі для прарасійскай арыентацыі Аляксандра Лукашэнкі як сярод сялян, так і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў. Дыскусію выклікаў даклад доктара Яўгена Мірановіча аб прарасійскай і прапольскай арыентацыях у беларускай палітычнай думцы на зломе XIX-XX стагоддзяў. Шмат невядомых падзей наблізіў прафесар Анатоль Грыцкевіч у дакладзе пра беларуска-літоўскую дывізію ў польскім войску, якая дзейнічала ў 1919-1920 гадах.

Яшчэ ў першы дзень канферэнцыі яе ўдзельнікі паехалі на экскурсію ў Гайнаўку, дзе наведалі Беларускі музей, Свята-Троіцкі сабор і Дом культуры.

— Ужо надрукаваныя даклады мінулагодніх канферэнцый у першым томе „Acta Albaruthenica", а другі том зараз рыхтуецца да друку ў Беларусі. Не хапіла нам грошай на яго хуткае выданне. Трэці том будзе датычыць сёлетняй падвойнай канферэнцыі, — сказаў прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

Аляксей Мароз

Фота аўтара

У сродках масавай інфармацыі працягваецца фестываль Самаабароны. Палітыкі і каментатары высвятляюць прычыны поспеху Анджэя Лепэра і яго партыі на парламенцкіх выбарах.

Самаабароны праўда аб Польшчы

У апошнюю нядзелю жніўня, пасля абеду, на пляцы перад пажарным дэпо ў Малінніках адбылася сустрэча кандыдатаў у паслы ад Самаабароны. Удзельнічала ў ім пад 300 асоб з усяго наваколля. Сустрэчу арганізавалі солтыс вёскі Ніна Іванюк, салэцкая рада і мясцовыя пажарнікі.

Ад імя Самаабароны сабраных прывітала Генавефа Віснеўская (цяпер ужо дэпутат Сейма), якая падзякавала за хлеб ды соль. Затым голас узяў Анджэй Лепэр, які выказаў свой погляд на шэраг спраў. Гаварыў крытычна і палымяна, а слухачы перарывалі яго выступленне апладысментамі і воклічамі „брава". А вось некаторыя меркаванні лідэра Самаабароны.

Аб грамадстве: Цешуся, што столькі людзей з адной мясцовасці прыходзіць на спатканне. Напэўна гэта сведчыць аб тым, што грамадства пачынае думаць, разважаць аб тым, што дзеецца ў Польшчы.

Аб перспектывах: Адзінаццаць гадоў перамен, адзінаццаць гадоў абяцанняў, надзеі на лепшае. І што бачым? Што жывецца нам штораз горш. Штораз меншыя шанцы для маладых, для нашых дзяцей і ўнукаў. Штораз большае зладзейства, карупцыя, раскраданне краіны.

Аб дзяржаве: Польшча — гэта не прыватны фальварак. Належыць яна нам усім, бо будавалі яе нашы бацькі і дзяды. А яны [кіраўнікі — рэд.] паставіліся да яе як да ваеннага трафея пасля пераможнай бітвы.

Аб уладзе: Адзінаццаць гадоў гаворым праўду аб Польшчы, аб тым што дзеецца ў краіне. Гаворым праўду аб зладзействе, аб карупцыі, аб фальшы. Сто трыццаць судовых працэсаў супраць мяне за тое, што гавару ім праўду ў вочы. Абражаюцца, калі тых, што дайшлі да ўлады пасля 1989 г., называю бандай злодзеяў.

Аб замежным гандлі: Час заблакіраваць імпарт з захаду і адблакіраваць экспарт на ўсход. Гэта наша дарога! Калі мы, як Польшча, не зразумеем гэтага, то прайграем. Захад гандлюе з Расіяй, Беларуссю, Украінай. Захад не гаворыць, што ў Расіі няма грошай, толькі кожны дзень пасылае з таварам тысячы аўтафураў, якія нішчаць польскія дарогі. Пара перастаць касавурыцца на Расію, Беларусь і Украіну. Польшча можа прадукаваць многа добрых тавараў, а рынкам збыту мусіць быць Усход.

Аб дзяржбюджэце: Дэфіцыт у гэтым годзе дасягне 100 млрд. зл., а даходы складуць 161 млрд. зл. Гэта абазначае катастрофу для дзяржавы. Да таго давяла гэтая банда злодзеяў. Не стае грошай на пенсіі і сацыяльную дапамогу. Але яны не шукаюць грошай у кішэнях багатых прадпрымальнікаў, не сцягваюць падаткаў ад фірм, толькі шныраць па кішэнях пенсіянераў, беспрацоўных, бедных людзей.

Аб фондах і агенцтвах: Палова бюджэту ідзе на фінансаванне фондаў і агенцтваў, у якіх працуюць паплечнікі кіруючай краінай каманды. Побач Міністэрства транспарту існуе Агенцтва па будове аўтастрадаў, хаця аўтастрады не будуюцца. Існуюць Міністэрства будаўніцтва і Установа па справах жыллёвага будаўніцтва; Міністэрства працы і Установа па працаўладкаванні; Міністэрства сельскай гаспадаркі і агенцтвы: сельскагаспадарчага рынку, рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, сельскагаспадарчай уласнасці і пад 150 фондаў, якія займаюцца польскай сельскай гаспадаркай. Усе, што там працуюць, бяруць казённыя грошы.

Анджэя Лепэра (у цэнтры) прывіталі ў Малінніках хлебам і соллю. Справа — солтыс Ніна Іванюк.

Анджэй Лепэр аднёсся таксама да асобы былога міністра фінансаў і цяперашняга старшыні Нацбанка Лешка Бальцаровіча, называючы яго „самым вялікім шкоднікам і знішчальнікам Польшчы, які каштуе Польшчу 500 тыс. зл. у месяц". Столькі палітыкі на гэтым свайго роду фэсце жыхары Маліннік і навакольных вёсак ніколі яшчэ не чулі. А калі надышла пара ставіць пытанні, Ілья Мартыновіч з Кашалёў спытаў пра адносіны Самаабароны да беларускай меншасці. Анджэй Лепэр адказаў яму наступным чынам:

— Станоўчыя! Лукашэнка ў тым што робіць у Беларусі, у большасці мае рацыю. Не ўпускае злачынцаў з Захаду і добра робіць. Не прадае ім беларускай зямлі, у адрозненні ад тых нашых. Аб тым, што там бяда, мы ведаем. Але сапраўды мы станоўча ставімся да беларускай, рускай, украінскай, нават і яўрэйскай меншасцей. Тых парадачных яўрэяў, якія жывуць у Польшчы, шануем. Навошта змагацца паміж сабою, жывем жа ж у адной краіне, маем аднолькавыя правы і мы напэўна аб беларускай меншасці, калі будзем у парламенце, не забудзем.

І хаця лідэр Самаабароны адказваў цьмяна і блытана, сабраныя выступленне ўзнагародзілі воплескамі і сардэчнымі падзякамі. Многія сяляне і пенсіянеры падыходзілі да стала, бралі мікрафон у рукі і ставілі гасцям пытанні наконт сельскай гаспадаркі. Анджэй Лепэр тлумачыў ім, што ўсе іншыя партыі, якія выказваюцца за далучэнне Польшчы да Еўрасаюза, хочуць дакончыць сельскую гаспадарку. Калі не зменіцца сацыяльная і гаспадарчая палітыка, Самаабарона выведзе людзей на мірныя дэманстрацыі, каб сказаць уладам: хопіць ужо злодзеям і юдам кіраваць Польшчай! Абяцаў ён яшчэ зменшыць на 75% зарплаты парламентарыям, міністрам і дзяржаўным чыноўнікам. І зноў пачуліся бурныя апладысменты, а адзін пенсіянер назваў лідэра Самаабароны „цудоўным чалавекам, які адкрыта і сумленна гаворыць нам, што дзеецца ў краіне".

Госці атрымалі кветкі і паслухалі беларускіх песень у выкананні калектыву „Красуні" з Краснага Сяла. Анджэй Лепэр падпісаў на памятку выбарчыя буклеты. Затым чальцы Самаабароны паехалі на чарговыя спатканні.

У выніку Самаабарона ў Арлянскай гміне заняла другое (пасля кааліцыі СЛД-УП) месца.

Міхал Мінцэвіч

У „другой Японіі"

Аўтобус з Беластока ў Залешаны едзе двойчы ў будзённыя суткі і тройчы ў святочныя. Той, што едзе рана, у нядзелю едзе яшчэ ў Ялоўку, забіраючы вернікаў у тамашнія храмы. Калі каму трэба ў Гайнаўку, той можа схадзіць на поезд у Цісоўку, але няма ўпэўненасці, ці тыя цягнікі яшчэ ездзяць, ці ўжо мо не...

У Залешанах, гледзячы на пастаўленыя ў вёсцы крыжы, жывуць каталікі. Да незнаёмага прыезджага адзываюцца па-польску, але калі загаварыць да іх па-свойму, ахвотна пераходзяць на родную ім мову — такую ж, як і беларуская літаратурная.

Вуліца ў Залешанах на тым адрэзку, па якім ездзіць аўтобус, пасыпана гравіем, але чым далей ад аўтобуснага маршруту, тым гравію менш, а за пяцьдзесят метраў яна ўжо такая ж, як і пры дзядах-прадзедах. Тая палявая вуліца-дарога нейкіх трыста метраў за ўсходнім канцом вёскі абрываецца на дзяржаўнай мяжы з Беларуссю.

Залешаны сёння прадстаўляюць жудасны від. Старыя хаты, бо новых у вёсцы няма, паволі здаюцца наступу часу. Гаспадарчыя збудаванні не маюць ужо сіл супраціўляцца маці-зямельцы, якая штораз больш прытуляе іх да сябе. Дзе-нідзе вярнуліся ўжо ў прах перагнілыя саламяныя кулікі-эгаісты, пакідаючы толькі абголеныя кроквы і латы. Дахі, крытыя чарапіцай, валяцца дружна.

На канцы вёскі, з боку дзяржаўнай граніцы, між высокіх таполяў паказваецца шэры школьны будынак. Выбіты ў ім усе вокны, пабіты дзверы, вырваны радыятары, пакрэмзаны сцены. Школа ў Залешанах была пабудавана яшчэ ў санацыйны час, а пры камуне прайшла рамонт. Закрылі яе ў сямідзесятыя гады, у час будавання „другой Польшчы". Вучыліся ў ёй толькі залешанскія дзеці. Цяпер у Залешанах толькі адзін вучань, а ягоная школа ў Шымках. Сёння дэмографы і сацыёлагі трывожацца, калі адно дзіця ў сям'і, што яно асірацелае... У Залешанах адно дзіця на ўсю вёску.

Калі за Залешанамі ўстанавілася дзяржаўная мяжа, у вёсцы было больш за семдзесят дзевак — столькі ж, колькі сёння ўсіх жыхароў вёскі. З гэтага ліку толькі бадай трое не атрымліваюць яшчэ пенсіі. Многія жывуць у адзіночку, у шматлікіх хатах і ніхто не жыве. Даўней пара чалавек працавала на чыгунцы, сёння ніхто нідзе не працуе. Больш за дваццаць гаспадароў здае малако ў мясцовую злеўню. Некалькі чалавек трымае па пяць-шэсць кароў. Спецыялістычных гаспадарак няма. У вёсцы каля дзесяці коней і дзве легкавушкі.

Лекар прымае ў адлеглых за пяць кіламетраў Шымках, а калі што, то хуткую трэба вызываць з Беластока. Ахвотныя паставілі ў сябе тэлефоны, але назбіралася іх нямнога, каля дзесяці. Водаправода ў вёсцы няма. У Залешаны заглядаюць тры аўтакрамы. У часе маёй пабыўкі адна праязджала. Прадавец цярпліва пад'язджаў па некалькі дзесяткаў метраў, спыняючы сваю машыну каля кожнага выйшаўшага са свайго панадворка. Апрача крамнікаў у Залешаны заглядаюць яшчэ пагранічнікі з Гарадка; за некалькі гадоў мо ўжо толькі адны яны будуць прыглядацца буйнай калісь вёсцы...

За Залешанамі, па дарозе ў Навасады, хутар з мураваным хлявом без даху; побач пасвяцца тры казы. З другога боку нехта абкошвае меліярацыйны раўчак. Каля ягонага воза сабака, які з лянівым брэхам падбягае да мяне і неспадзявана хапае за нагу. Пасля такога тэрарысцкага акту прымаю рашучыя меры і ён адбягае да гаспадара, які адабральна яго гладзіць: добра зрабіў, няхай навалач не валочыцца. За паваротам на дарогу перада мною выходзіць малады мужчына, нешта пабліскваe ў ягоных руках. Мінаючыся бачу, што гэта ружанец з металічнымі медалікамі. Дагэтуль уяўлялася мне, што ружанцы носяць толькі манашкі і пажылыя бабулькі...

У Навасадах нечаканасць — нехта будуе гаспадарчы будынак, бачыць тут будучыню! У вёсцы на вуліцы брук. На канцы вёскі нейкая крама, на маю здарожаную радасць — адкрытая. Вяндліны ў ёй не было, пернікаў толькі адзін пакецік, шакаладу няма. Ніхто цяпер тут шакаладу не купляе, тлумачыць прадаўшчыца, бо скончыліся канікулы, дзеці выехалі ў гарады, а мясцовыя пенсіянеры, хворыя дыябетам, не купляюць салодкага. З напояў прапануе яна мне такія, якія п'юць у маладой кампаніі... З Навасадаў чацвёра школьнікаў і адзін гімназіст.

Шымкі вітаюць мяне будынкамі колішняй „другой Польшчы" — пустуючай гэсаўскай базай на водшыбе вёскі; калісь працавалі там трактарысты, камбайнеры, кнігаводы, сторажы ды іншыя рабочы клас, сялянства і працоўная інтэлігенцыя. Побач няскошаная грэчка і зарастаючая пырнікам пожня з несабранай саломай. З другога боку зеляніцца рунь азіміны. Суседняя згаданай базе буйная калісь гэсаўская крама — пустуе. Ці ж і ў Шымках няма крамы — дзівуюся. Заходжу ў вёску, бачу шыльду „Sprzedaż trumien" — значыць сённяшняя вясковая дэмаграфія ў нейкім сэнсе спрыяе бізнесу! Далей ёсць і вялікая „звычайная" крама, і піўная. У будынку пажарнага дэпо таксама крама з багатай прапановай вясковай душы.

Аляксандр Вярбіцкі

Пасол з Гаркавічаў

У міжваенны перыяд беларуская грамадскасць Беласточчыны, якая налічвала каля трыста тысяч чалавек, мела толькі аднаго пасла ў Сейме Польшчы — Паўла Валошына. У сапраўднасці быў гэта адзіны пасол, які ў Сейм трапіў са спіска нацыянальных меншасцей. Пасляваенная прысутнасць беларусаў у Сейме гэта вынік ласкі лідэраў польскіх партый. Хаця Валошын парламентарыем быў усяго тры гады, аднак яго прысутнасць у палітыцы заўважылі ўсе, асабліва пракуроры і паліцыянты з Беластока і Гродна. Валошын вылучаўся перш за ўсё надта шчырымі выказваннямі пра дзяржаўную палітыку на землях, дзе пражывалі грамадзяне беларускай нацыянальнасці. Палякі, якія тады пачыналі тварыць міф талерантнай і свабодалюбівай нацыі, вымушаны былі слухаць у Сейме пра катаванні беларускіх сялян у польскіх турмах, пра здзічэласць крэсавай адміністрацыі, пагардлівае стаўленне ўлад да мясцовага насельніцтва. Чулі пра сябе тое, што самі гаварылі пра расіян ці немцаў. Зразумела, прамовы Валошына не маглі падабацца таварышам Рамана Дмоўскага, Вінцэнта Вітаса ці Язэпа Пілсудскага. Таму яго палітычная кар'ера не была надта доўгая.

Павел Валошын нарадзіўся 10 ліпеня 1891 г. у вёсцы Гаркавічы на Сакольшчыне. Быў сынам праваслаўнага селяніна. Пра яго адукацыю вядома толькі тое, што закончыў 6-гадовую школу, праўдападобна ў Крынках. У гэтым мястэчку ў 1908-1912 гадах працаваў тэлефаністам на пошце. Год да вайны быў прызваны ў царскую армію. Змагаўся на нямецкім фронце і на пачатку вайны трапіў у палон. Пасля вызвалення з лагера для ваеннапалонных у 1917 г. выехаў у Расію шукаць сваю сям'ю, якая ў 1915 г., разам з праваслаўным насельніцтвам Беласточчыны, падалася ў бежанства. У Расіі Валошын быў сведкам унутранай вайны. Стаў гарачым прыхільнікам чырвоных, спачатку служыў міліцыянерам, пасля ў нявысветленых акалічнасцях трапіў у армію Дзянікіна. У 1920 г. служыў у Чырвонай Арміі, трапіў у палон да пятлюраўцаў, а пасля вызвалення працаваў на чыгунцы.



Валошыны вярнуліся ў Гаркавічы ў 1922 г., калі ў Польшчы ішла выбарчая кампанія ў Сейм першага склікання. Павел атрымаў тады працу манцёра паштовай інфраструктуры і меў кантакт з рознымі людзьмі Сакольскага павета. Цікавіўся палітыкай і быў адважны, таму вельмі хутка апынуўся ў акружэнні людзей, якія імкнуліся арганізаваць беларускую грамадскасць на Сакольшчыне. Стаў дзеячам Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і быў вылучаны кандыдатам у Сейм са спіска Блока нацыянальных меншасцей. Ад жніўня 1923 г. стаў паслом, членам Беларускага пасольскага клуба, якім кіраваў Браніслаў Тарашкевіч.

Валошын шмат ездзіў па Беласточчыне, сустракаўся з беларускім насельніцтвам, заклікаў арганізавацца і смела выступаць за свае грамадзянскія правы, патрабаваць усяго таго, што давала канстытуцыя. Быў адначасова найбольш пільнаваным паліцыяй і агентамі бяспекі беларускім паслом. У паліцыйных дакументах захаваўся змест яго прамоваў да публікі, сабранай пад адкрытым небам. Відаць, пастаянна сачыла за ім некалькі агентаў паліцыі. Беластоцкі і гродзенскі пракуроры не раз звярталіся ў Сейм, каб пазбавіць Валошына імунітэту за непрыхільныя словы ў адрас дзяржаўных улад на мітынгах.

Эканамічная і палітычная дыскрымінацыя беларусаў у II Рэчы Паспалітай нараджала радыкалаў. Калі ў чэрвені 1925 г. узнікла Беларуская сялянска-работніцкая грамада, Валошын у натуральны спосаб стаў адным з лідэраў гэтай партыі. У Сакольскім павеце, дзе ён меў найбольшы кантакт з насельніцтвам, у рады Грамады ўступалі часам усе дарослыя жыхары вёсак. Валошын быў надта папулярны сярод насельніцтва, а таму і небяспечны для ўлад. Ад восені 1926 г. заўсёды цягнуліся за ім атрады паліцыі. У лістападзе сілай не дапусцілі да з'езду дзеячаў Грамады Сакольскага павета. На з'езд грамадоўцаў Бельскага павета ў Стараберазове ўлады паслалі не толькі атрады паліцыі, але таксама вайсковыя падраздзяленні. Падчас сутычкі сялян з урадавымі фарміраваннямі ў Стараберазове Валошын быў моцна паранены.

У лютым 1927 г. найвышэйшыя дзяржаўныя ўлады вырашылі ліквідаваць Грамаду. Валошын быў сярод 56-ці арыштаваных дзеячаў партыі. Падчас працэсу ў Віленскім акруговым судзе пракурор абвінавачваў кіраўнікоў партыі ў імкненні да знішчэння Польшчы і адлучэння ад яе паўночна-ўсходніх ваяводстваў. Пастановай суда Валошын быў прыгавораны да 12 гадоў турмы. Вызвалілі яго ў 1932 г., два гады пазней чым Тарашкевіча і іншых кіраўнікоў партыі. Сядзеў найдаўжэй з усіх грамадоўцаў. У выніку абмену палітычнымі вязнямі апынуўся ў Савецкім Саюзе. Ездзіў там ад горада да горада і распавядаў пра нацыянальную палітыку польскіх улад. На пачатку 1933 г. стаў працаваць у органах бяспекі. У гэтым самым часе НКУС пачаў арыштоўваць усіх дзеячаў беларускага руху, якія хаця б кароткі час не былі пад яго наглядам. Валошын шмат гадоў прасядзеў у польскай турме за змаганне за нацыянальныя інтарэсы беларусаў. Для саветаў быў гэта доказ яго нацыяналістычнага мышлення. Валошына арыштавалі 1 верасня 1933 г. Пасля доўгіх допытаў партыйны суд прыгаварыў яго да найвышэйшай меры пакарання, але адмяніў прысуд на 10 гадоў лагера на Салаўках. 9 верасня 1937 г. суд ленінградскага НКУС вырашыў расстраляць Паўла Валошына. Прыгавор быў выкананы 3 лістапада 1937 г.

Біяграфія Валошына сімвалічна паказвае, што беларусы не мелі ў XX стагоддзі ніякіх саюзнікаў. Суседзі забаранялі быць беларусамі. Адны за гэта саджалі ў турму, другія — расстрэльвалі.

Яўген Міранові́ч

Гродна і Ваўкавыск у II Рэчы Паспалітай

Зараз у Этнаграфічным музеі ў Гданьску знаходзіцца выстава, прысвечана двум гарадам даваеннага Беластоцкага ваяводства — Гродну і Ваўкавыску. Адкрывае яе карта ваяводства з 1933 г. і герб Гродна, выкананы скульптарам Варшаўскай акадэміі мастацтваў Багданам Хмялеўскім.

Далей ідуць здымкі Гродна і яго жыхароў, школьныя і сямейныя памяткі: сшыткі, пасведчанні, альбомы, дакументы, выданні, школьныя штандары. Далей у такой жа чарговасці прадстаўлены Ваўкавыск.

Узбагачаюць выстаўку таксама акварэлі Вітаўта Калбана, народжанага ў 1935 г. у Гродне. Зараз мастак жыве ў Тыхах. У 1994 г. паехаў, упершыню пасля 50-ці гадоў, на бацькаўшчыну. Сантыментальнае падарожжа прынесла плён у выглядзе цёплых акварэляў з відамі Гродна яго дзіцячых гадоў: „Spróbowałem namalować pejzaże lat dziecinnych, podpierając się starymi fotografiami, rycinami, opowieściami mieszkańców i własną miłością do tego wspaniałego grodu".

Ваўкавышчыну прадстаўляюць рысункі Вітаўта Карпызы, які нарадзіўся ў 1913 г. у Зеленяўцах, а зараз жыве ў Гажове-Велькапольскім. Сярод іх можна знайсці нават рысунак царквы ў Юшкавым Грудзе. Апрача цэркваў і касцёлаў, на рысунках прадстаўлены сінагогі, двары і іншыя помнікі архітэктуры.

Выстава адкрылася 12 ліпеня г.г. і будзе працягвацца да канца кастрычніка. Яе аснову складаюць экспанаты прыватных калекцый — налічыла я 88 іх ахвяравальнікаў.

Пры ўсім сваім багацці выстава ўсё ж аднабаковая — выразна вытрыманая ў стылі польскіх усходніх крэсаў. Дарэчы, гэта чарговая выстава — пасля выставак пра рэпатрыянтаў, Палессе і Валынь — з цыкла „Сантыментальныя падарожжы па даўніх крэсах". Аўтаркай канцэпцыі выставы з'яўляецца Вікторыя Бляхарская, кіраўнік Этнаграфічнага музея. Сама яна родам з Браслаўшчыны, з вёскі Замошша, адкуль выехала з бацькамі ў Польшчу ў 1959 г. двухгадовай дзяўчынкай. Родную вёску адведала два гады таму.

Выставу дапамаглі сарганізаваць (таксама фінансамі) Таварыства сяброў Гродзенскай і Віленскай земляў з Гнева, Таварыства гродзенцаў імя Элізы Ажэшка з Варшавы і Таварыства сем'яў Ваўкавыскай зямлі з Гданьска, Таварыства „Вспульнота Польска" — Паморскі аддзел. Хаця ў даведніку і на выставе згадваюцца беларусы (пасля палякаў і расіян), цяжка знайсці гэтую нацыянальную мазаіку на здымках ці ў дакументах. Наадварот, яны даказваюць польскасць Гродна і Ваўкавыска, якая з 1919 г. беспардонна ўводзілася на гэтых землях. Тут мне згадаліся лёсы беларускіх інтэлігентаў Гродзеншчыны, Серафімы і Лукі Дзекуць-Малеяў, якіх за беларускую асветную працу польскія ўлады выкінулі з Гродна, паслоў Сяргея Барана і Шымана Якавюка, якіх за беларускую дзейнасць судзілі ў Беластоку ў 1923 г., пасла Уладзіміра Каліноўскага з Ваўкавыска, які не атрымаў польскага грамадзянства і вымушаны быў падацца ў Савецкую Беларусь.

З гродзенскага духавенства паказаны адны каталіцкія ксяндзы. Найбольш месца прысвечана ксяндзу Антонію Курыловічу, старшыні Польскай Мацежы Школьнай і дырэктару пачатковай школы „бернардынкі". Таксама ў пару месцах выставы можна пабачыць ксяндза Францішка Грынкевіча (на здымку), родам з Новага Двара на Сакольшчыне, як заслужанага для польскасці святара і настаўніка. Гэтая постаць асабліва блізкая беларускаму нацыянальнаму руху. Яшчэ да I сусветнай вайны быў ён ініцыятарам і стваральнікам Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, засяваў беларускую нацыянальную свядомасць сярод навучэнцаў гродзенскіх школ. Вядома, што пасля вайны не мог сеяць беларускасці ў Гродне, калі хацеў там жыць. Тым не менш, яго родны брат Станіслаў і братанак Станіслаў, пад яго духовай апекай, выраслі на беларускіх нацыянальных дзеячаў. Пра беларускасць ксяндза нідзе не згадваецца.

Няма на выстаўцы ніводнага праваслаўнага святара, хаця на здымках Гродна і Ваўкавыска паказаны і цэрквы.

Агледзеўшы выставу, можна сцвердзіць, што Гродна і Ваўкавыск гэта польскія гарады, а пасля II сусветнай вайны адбылася вялікая несправядлівасць, у выніку якой апынуліся яны ў Савецкай Беларусі, а палякі трапілі або ў ссылку, або вымушаны былі ўцякаць у новую Польшчу. Варта тады задумацца — а дзе ж у II Рэчы Паспалітай былі беларусы, ці не было іх у Гродне, Ваўкавыску, калі не мелі сваіх школ, тэатраў і іншых устаноў? Ці можа іхнія правы да беларускага існавання на сваёй зямлі зневажаліся польскай уладай? Гэтыя пытанні стаўлю дзеля змагання з міфам польскіх усходніх крэсаў, які прапагандуюць такія выставы, як гэтая ў Гданьскім этнаграфічным музеі. Тым не менш, калі хто наведае Гданьск да канца кастрычніка, рэкамендую зазірнуць у музей і паглядзець уласнымі вачыма выставу пра беларускія сёння гарады Гродна і Ваўкавыск, каб мець уяву пра іх мінулае ў 20 — 30-я гады XX стагоддзя.

Лена Глагоўская

Пахі свежасці! З іншых — усё ў танацыі сандалавага дрэва, мяшанкі з новай араматнай нотай. Духі — як вопратка!..

З Гжэськам-„Лапам” пра парфуму

— Калі ты, „Лапа”, вучыў мяне хадзіць і пры першым нашым сутыкненні сказаў, што мая парфума падыходзіць мне, я падумала, што гэта звычайны камплімент, патрэбны хвораму. Адкуль такі малады хлопец, ды яшчэ фізіятэрапеўт, можа ведаць нешта пра парфуму...

— Я раней быў кансультантам і дыстрыбутарам у касметычнай фірме „LINE RAICINE”. Там мяне навучылі адрозніваць пахі. Быў у іх чалавек, які займаўся навучаннем маладых працаўнікоў. Ёсць, напрыклад, араматы цяжкія і лёгкія, кветкавыя і арыентальныя.

— Калі якую парфуму трэба ўжываць?

— Удзень — свежую, вечарам — цяжэйшую, арыентальную.

— Ці парфума павінна быць дастасаваная да выгляду жынчыны?

— У нашай фірме была нават астралагічная табліца, пры дапамозе якой мы прапанавалі кліенткам выбіраць сабе адпаведныя пахі. Аднак жа толькі палова кліентак звяртала на гэту табліцу ўвагу. У нас была звычайная касметыка і вельмі рафінаваная, элегантная. Незадаволеным кліенткам я прабаваў дапамагчы і выбіраў сам.

— І яны былі задаволены?

— Амаль заўсёды.

— Як і калі ўжываць парфуму?

— Найлепш адразу пасля ванны ці душа, калі цела абсушана. Пырскаем у тых месцах, дзе скура найбольш далікатная і ў ваколіцах аорты.

— Чаму?

— Аорта пульсуе і спрыяе выдзяленню араматных субстанцый.

— Большасць жанчын любіць прафумавацца за вухам.

— Памылка. За вухам знаходзіцца шмат лоевых залоз і ў спалучэнні з парфумай можа атрымацца непрыемны пах.

— Нават і тады, калі вушы былі толькі што памытыя?

— Нават і тады.

— Дык дзе канкрэтна было б парфумаваць цела найлепш?

— Валасы (памытыя), шыя, запясце. Вось, напрыклад, няхай мужчына, памыўшы валасы, псікне на іх добры адэкалон і ўватрэ яго ў валасы ручніком — дзяўчына гатова.

— А якія ты, „Лапа”, любіш араматы?

— Пахі свежасці. З іншых — усё ў танацыі сандалавага дрэва, мяшанкі з новай араматнай нотай. Духі — як вопратка. Усё звязана з настроем чалавека. Калі ў чалавека дэпрэсія — адны, калі ён вясёлы — іншыя. Важна таксама, каб былі яны падабраны адпаведна да пары года. Летам лепш ужываць парфуму, напамінаючую пахі кветак, фруктаў, дрэў. Свежыя!

— Ці варта парфумавацца інтэнсіўна?

— Ні ў якім выпадку. Дастаткова зрабіць гэта раніцай, пасля ванны ці душа. Запах павінен быць лёгкі, ён не можа цягнуцца за чалавеккам.

— А французжанкі парфумуюцца даволі інтэнсіўна.

— Яшчэ ў мяне не было дзяўчыны з Францыі. Праўда, была ў нас жанчына, цётка, адтуль. Я заўважыў, што ў яе было ўсё ў парадку, як трэба.

— А што ты думаеш на тэму вопраткі? Я, напрыклад, люблю надзець жакет, які пахне маёй парфумай.

— Можна пырснуць і на вопратку, але толькі тады, калі яна чыстая, памытая.

— Часамі бывае, што жанчына карыстаецца дэзадарантам і парфумуецца. Эфект страшны.

— Трэба купляць дэзадарант і парфуму ў адной танацыі або дэзадарант без паху.

— Купіць добрую парфуму, калі яе не ведаеш, справа нялёгкая. Калі я першы раз узяла ў рукі „Армані” і псікнула на руку, думала, што задушуся. Выйшла з парфумерыі, а мне мая рука смярдзела. Іду, усё панюхваю спырсканае месца, незаўважальна спавальняю крокі і нават не заўважаю, што ўжо імчуся назад. Купляю, бо праз нейкі час высветлілася, што тое месца на „смярдзючай” руцэ пахла раем.

— Вось менавіта. Як купляць парфуму? Спачатку пырснуць на руку, пачакаць, што будзе, пахадзіць з гэтым араматам, а тады ўжо будзе вядома, ці ён табе падыходзіць.

— Як мужчыны рэагуюць на запахі?

— На запахі мужчын ці жанчын?

— Ну, сябе, бадай, чалавек не абнюхвае...

— Рэагуе пазітыўна, калі пах жанчыне падыходзіць і не вульгарны. Не пераношу семнаццацігодак, якія пахнуць „Опіумам”. Ім найлепш не парфумавацца, а калі ўжо — дык павінны яны пахнуць далікатнымі кветкамі, фруктамі. Цяпер такія араматы модныя.

— А калі ў кагосьці слаба з грашыма, што можа ён купіць?

— Вядома, купіць таннейшую, але няма гарантыі, што будзе яна такая ж добрая.

— Дзякую за інструктаж.

Гутарыла
і фатаграфавала Ада Чачуга

Выстаўка лялечных герояў

У Гайнаўскім доме культуры 29 верасня маладыя акцёры разам з апекуном Вольгай Андраюк, дырэктарам Міколам Бушко, яго намеснікам Ірэнай Парфянюк і працаўнікамі Дома культуры адкрылі выстаўку лялечных герояў.

— Дзякую вам за радасць, якую даяце гледачам, і за цудоўных акцёраў, якіх вы зрабілі, — заявіў дырэктар М. Бушко, адкрываючы выстаўку. — Ваш лялечны тэатр адзіны такі ў Гайнаўцы ды можна яго ўключыць у групу лепшых тэатраў Польшчы.

Апякун тэатральных груп, Вольга Андраюк, паведаміла, што першы лялечны спектакль — „Пшанічны каласок” — ставіўся на беларускай мове і гайнаўскія вучні, выступаючы з ім на Аглядзе беларускіх тэатраў у Кляшчэлях у 1996 годзе занялі першае месца. З гэтага часу тэатральныя калектывы ГДК выступалі на сваёй сцэне, у гайнаўскіх дзіцячых садках, навакольных вёсках — агулам 13 спектакляў на польскай і беларускай мовах.

— Лялькі не ўзнікалі хутка. Спачатку мы чыталі казкі, а пасля вучні самі рысавалі герояў. З гэтых занатовак рабілі мы супольныя праекты і выконвалі лялькі. Памагалі шыць і хлопцы, а некаторыя аказаліся добрымі майстрамі, — пахваліла выхаванцаў В. Андраюк.

Арганізатары спаткання нагадалі таксама пра сцэнографаў Дома культуры, Зінаіду Якуць і Анну Тарасюк, якія дапамаглі пры сцэнічным афармленні пастановак і музыкаў — Алу Саевіч і Мікалая Сідарука. Аднак найбольш працы заставалася спадарыні Андраюк, якая спачатку пісала сцэнарыі, потым з вучнямі выконвала лялькі, са спецыялістамі падбірала музыку, сцэнічнае афармленне і праводзіла рэпетыцыі. Вучні адзначылі, што прыемна ўспамінаюць і рэпетыцыі, і выезды на выступленні.

В. Андраюк з вучнямі па чарзе знаёмілі прысутных з героямі лялечных спектакляў, адзначаючы, што некаторыя лялькі пасля перапрацовак выкарыстоўваліся ў іншых пастаноўках. Спадарыня Вольга сказала, што да беларускіх спектакляў падбірала больш простыя тэксты, каб выступленні былі зразумелымі гайнаўскім дашкольнікам, якім, у галоўным, і накіроўваліся пастаноўкі.

З беларускімі спектаклямі гайнаўскія вучні ездзілі на Агляд тэатральных калектываў у Кляшчэлі і там заваёўвалі ўзнагароды. Спецыяльную ўзнагароду атрымала пастаноўка „Валовая хатка”, а апошні спектакль — „Цар Ірад” — паспяхова прэзентаваўся на павятовым і ваяводскім аглядах калядных калектываў. Пастаноўка „Кот Мурлыковіч” не атрымала ўзнагароды, але вельмі спадабалася гайнаўскім дзеткам.

Маладыя акцёры разам з апекуном Вольгай Андраюк, дырэктарам Міколам Бушко і працаўнікамі ГДК.

— На занятках панаўе прыемная атмасфера і таму мы на іх ходзім, — заявіла Бася Каліноўская, лепшая расказчыца, якая здабывала ўзнагароды і ў дэкламатарскіх конкурсах, і ў конкурсе расказчыкаў, які праводзіцца ў Гайнаўскім белліцэі.

У беларускай групе ігрой на сцэне вылучаюцца Бася Гарлоўская, Дыяна Нікалаюк, Каміль Андраюк, Ярак Семянюк і Кася Чурак.

Пасля адкрыцця выстаўкі вучні зрабілі супольную фатаграфію. Многія адразу заявілі, што будуць удзельнічаць у занятках лялечнага тэатра. Выстаўку можна глядзець у ГДК яшчэ на працягу некалькі тыдняў.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Як адукаваць у школе

Міністэрства нацыянальнай адукацыі прапануе настаўнікам, выхаваўцам, а таксама самаўраднікам, рэгіяналістам, партнёрам і саюзнікам школы том*, які датычыць заданняў школы ў галіне рэгіянальнай адукацыі.

Кніга, апрача порцыі праграмных прапаноў і сцэнарыяў заняткаў, прадстаўляе матэрыялы, якія ўносяць у праблематыку рэгіянальнай адукацыі новыя пытанні. Напрыклад, ахова гістарычнага краявіду і належнае фармаванне прыроднай і гістарычнай прасторы краіны. Падаюцца праўныя акты і дакументы, таксама і міжнародныя, якія датычаць згаданых тэм, праграмна-метадычныя праграмы і прапановы. Напрыклад, еленягурскі сцэнарый „Я — спадчыннік гэтай зямлі”, на падставе якога можна правесці заняткі ў любой школе, аўтарская праграма дадатковых заняткаў для I-III класаў пачатковай школы, праграма заняткаў „Этычныя каштоўнасці ў рэалізацыі рэгіянальнай адукацыі”, прагарама курсаў для кандыдатаў на школьных лідэраў краязнаўчай адукацыі, сцэнарыі адукацыйных заняткаў „Мой родны горад”, „Мая малая айчына”, сцэнарыі інтэграваных заняткаў у музеі (далучаны „карты працы”), методыка школьных экскурсій, прапановы такіх экскурсій (у дадатку — адрасы ўсіх нацыянальных і ландшафтных паркаў, батанічных садоў, этнаграфічных музеяў і скансэнаў, музеяў інтэр'еру, цэнтраў экалагічнай адукацыі, таксама і ўрадавай адміністрацыі, ваяводскіх захавальнікаў прыроды). У бібліяграфіі фіксуюцца кнігі пра рэгіяналізм і рэгіянальную адукацыю, пра польскія рэгіёны, метадычная літаратура і дапаможнікі, планы і карты, часопісы. Выданне гэтае, на нашу думку, проста неацэнны дапаможнік для сучаснага настаўніка, які ў рэфармаванай школе бярэцца за рэалізацыю праграм адукацыйнай сцежкі „Рэгіянальная адукацыя — культурная спадчына ў рэгіёне”. Кнігу набыць можна ў Цэнтры ўдасканальвання настаўнікаў у Беластоку. Юры Кузьмюк прапануе таксама кнігу „By czas nie zaćmił i niepamięć” — сцэнарыі заняткаў па культурнай спадчыне ў нашым рэгіёне — метадычныя матэрыялы для настаўнікаў пачатковых школ і гімназій.

Міра Лукша

* *Edukacja regionalna. Dziedzictwo kulturowe w zreformowanej szkole. Materiały dla nauczycieli*, Ministerstwo Edukacji Narodowej, Wrocław 2000, ss. 188.

Зорка

старонка для дзяцей

Мартынка — лясная дзяўчынка

Мартына Ева Леанеўская ўжо другі раз прымала ўдзел у літаратурным конкурсе. Летась напісала кароценькае апавяданне пра шчанюка, якога знайшлі ў бабулінай вёсцы на ўскраіне пушчы, на канікулах. Пасля той сабачка, Максік, дзесьці прапаў. Не хацелася дзяўчынцы пра сумнае пісаць у апавяданні, дык закончыла яго ў момант, калі яны пачынаюць сябраваць. Бо нашто сум наводзіць на сябе і іншых... Жыццё само па сабе сумнае бывае, здаецца, і не чакай ад яго радасці. Мартынка ў пяць гадоў страціла дзядулю і тату, сваіх самых лепшых сяброў... І прывыкаць трэба было ўсё да іншага кутка. Пакідаць свой дом таксама цяжка... Жыла Мартынка спачатку, калі зусім маленькая была, у самай блізкай да Белавежскае пушчы вёсцы Баравыя, пасля ў двух розных хатах у вёсцы Міклашэва, ды не ў доме, які для яе будаваў тата. Цяпер — разам з мамай Аляй, братам Кандратам і татам Мірыкам — у вёсцы Лясной, на хутары. Усе гэтыя мясціны — *лясныя*, падпушчанскія. У Нараўчанскай гміне. І звяроў тут поўна, і дрэвы шумяць яшчэ магутныя. У школу досыць блізка — у нараўчанскую, сучасную, светлую, прыгожую. З такое школы дык і не выходзіў бы... І клас файны — VI „б". Вершыкі пісала Мартынка, тыя, конкурсныя, у пятым класе, дык і... „Пятка" падпісалася. Пра клас, пра маму, і пра буслоў... Вось цікавая тая бусліная мова, і жыццё іхняе — лятаюць па свеце, і назад вяртаюцца, і па-свойму клякочуць... (лук)



Мартына Ева Леанеўская.

Фота Міры Лукшы

Рэч пра маю маму

Мая мама ёсць вясёлай,
Усё прыбірае ўкола,
Калі кубікі раскіну,
Усе назад іх у скрынку кіне.

Час ад часу — бяда ў хату,
Калі „падпаду" я тату.
Тады ёсць ратунак — мама,
Зменіцца ў камедыю драма.

Люблю вельмі сваю маму,
Што лякарствам ёсць на рану.
Дачкой буду паслухмянай,
Каб кахала мяне мама.

Пяты клас

Каб найлепшай быць у класе
Хочацца дзяўчынцы Касі.
Але ў класе многа Касяў,
У Касю кожная ўдалася.
А Мартынка — адна ў школе.
Няма тут Мартынак болей.
Ці шасцёрку, ці адзінку
Сёння дастае Мартынка,
Дык усе ведаюць у школе
А таксама ў наваколлі.

Тутэйшыя буслы

Кажа бусел па-арабску,
навучыўся ён у Егіпце.
А бусліха,
што зімавала ў Турцыі,
па-турэцку размаўляе.
Па-суседску пасяліліся.
І пажаніліся.
Пэўна, па-польску
Іх бусляняты гавораць.

Мартына Ева Леанеўская
в. Лясная

Польска-беларуская крыжаванка н-р 42

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 38: Кіт, абрус, калыска, лодка, ложа, дарога, смак, мір, Анды, грыбы. Кут, міг, калода, ложак, брыда, скромны, гуска, парыў.

Узнагароду выйграла **Люцына Джэга** з Тафілаўцаў, вучаніца II класа Гімназіі ў Дубічах-Царкоўных.

Успамін з канікул

Канікулы ў большасці правяла я дома. Вельмі многа часу прабывала з сябрамі з маёй мясцовасці. Разам з імі я арганізавала вогнішча, пры якім мы сядзелі і спявалі да позняй ночы. Калі ўжо на двары цямнела, хлопцы прабавалі нас палохаць, але, у сапраўднасці, гэта яны са страхам ішлі дадому. Калі было цёплае надвор'е я ездзіла на вадасховішча Бахматы. Там часта разыгрываліся футбольныя матчы і я заўсёды апладзіравала хлопцам з маёй мясцовасці, але, на жаль, яны прайгрывалі.

У другой палове канікул я ездзіла да бабулі і там разам з маімі сёстрамі хадзіла на дыскатэкі. Там я пазнаёмілася з многімі хлопцамі, з якімі сустракаюся да сёння. Некалькі разоў, калі позна вярталіся з дыскатэкі, спалі ў палатцы, таму што не хацелі будзіць бабулю. Аднойчы пайшлі за намі хлопцы, мы падумалі, што яны хочуць нас напалохаць і падрыхтавалі на іх засаду. Увайшлі мы ў палатку, але выйшлі з другога боку. Хлопцы думалі, што мы ў ёй знаходзімся і леглі спаць. Тым часам мы чакалі хлопцаў пад дрэвам. Калі яны акружылі палатку, мы выскачылі з-за дрэва і так іх напалохалі, што яны не ведалі куды ўцякаць. Адзін хлопец упаў адной нагой у септык, а другі — у куст калючых руж. На другі дзень мы іх перапрасілі, а яны паабяцалі нам, што гэтае ніколі не паўторыцца.

Вярнуўшыся дамоў, я з сябрамі вырашылі арганізаваць пікнік. На веласіпедах паехалі ў лес, які знаходзіцца 15 кіламетраў ад маёй мясцовасці. У палавіне дарогі пачаў ісці дождж. Мы схаваліся пад вялікі дуб, але і так прамоклі да сухой ніткі. Потым засвяціла сонца і мы рашылі працягваць наша падарожжа. Калі мы ўжо заехалі ў лес, усе былі вельмі галодныя. Хлопцы разаслалі плед, а я пайшла па карзінку з ядой. Калі яе падняла, выявілася, што яна вельмі лёгкая. У карзінцы была толькі вада, сяброўка забылася пакласці туды ежу. Дадому мы вярнуліся мокрыя і галодныя, але вельмі задаволеныя. Не паспела я і аглянуцца, так хутка прайшлі канікулы і зноў трэба ісці ў школу. Але гэта не канец свету, праз год зноў будуць канікулы!

Агнешка Занкевіч,
III „в" кл. Гімназіі ў Орлі

У Нараўцы — сэрцу роднае

Нараўчанская школа — шасцігодка і гімназія — шчыра сустрэла ўдзельнікаў міжнароднай канферэнцыі „Культурная спадчына падляшскага пагранічча". У плане гэтай сустрэчы было наведанне школ, у якіх рэалізуецца праграма міжпрадметнай сцежкі „Рэгіянальная адукацыя, культурная спадчына ў рэгіёне". Сярод польскіх настаўнікаў былі таксама госці з Літвы і Беларусі. І хіба іх найбольш захапіла выступленне вучняў — школьнікаў і гімназістаў, якія з тэмпераментам прадставілі і гісторыю школы, і шматкультурнасць рэгіёна. Рыхтавалі іх не толькі да гэтага выступлення пані Зузанна Падэўская, Аліна Саевіч і ўдзельніца канферэнцыі пані Вацлава Суліма. Пачалося ад песні пра родны горад, праз „вязанку" колішніх польскіх гітаў і „Смэрэко" (гэта якраз была песня пра школу!), песні пра каханне (да „чарнявага Іванкі", якім аказаўся залатавалосы Адрыян), жыдоўскі танец, беларускія сваты, танец „Душкаў з пушкі"... „Беларускае — сэрцу роднае!" — спявалі ўсе на аграмадным калідоры ў цэнтры школы, а гледачы, адораныя букецікамі асенніх кветак, у захапленні пляскалі ў далоні, усхваляваныя і вельмі радыя. Тым больш былі яны ашаломлены, калі рушылі па школе, наведваючы ўсе кабінеты, нават настаўніцкі пакой ды кабінет дырэктара. Ахам і охам не было канца; здаецца, вучоныя госці гатовы былі зноў сесці за парты, абы толькі ў такой школе... Еўропа! — казалі. І праўда, маеце чым ганарыцца, вучні нараўчанскай школы!

(лук)

Фота Міры Лукшы

Госці атрымалі ў падарунку сшыткі-рэкламоўкі нараўчанскай школы.

„Душкі з пушкі" кіпяць тэмпераментам.

На ўроку геаграфіі.

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Канцлер Леў Сапега

На дзяржаўнай службе

З дапамогаю сваіх апекуноў — Радзівілаў — Сапега быў прыняты на службу да караля і вялікага князя Сцяпана Батуры. Гаспадару дзяржавы спадабаўся адукаваны юнак, які старанна выконваў усе даручэнні.

Сапега меў выдатную памяць і бліскуча ведаў законы Вялікага княства. Ён быў заўсёды ветлівы, сціплы і сумленны. Гледзячы на яго, кароль гаварыў, што Леў Сапега будзе дзяржаўным чалавекам. І ён не памыліўся.

Тым часам, як вы памятаеце, ішла вайна з Масковіяй, што хацела захапіць беларускія землі. Сапега за свае грошы, якія атрымаў у спадчыну ад бацькі, стварыў і ўзброіў цэлы полк, а сам стаў яго камандзірам.

За мужнасць у змаганні з ворагам кароль прызначыў Сапегу на адказную пасаду сакратара Вялікага княства. З гэтага часу ён змог цалкам заняцца дзяржаўнымі справамі.

З поўдня нашай Бацькаўшчыны пагражалі туркі і крымскія татары. Каб адбіцца ад іх, трэба было падпісаць замірэнне з іншым ворагам — Масковіяй. Леў Сапега выправіўся з пасольствам да расійскага цара і падпісаў мірную дамову на дзесяць гадоў, а таксама вызваліў з царскага палону 900 беларусаў.

Таленавіты палітык і дыпламат атрымліваў усё новыя і больш высокія пасады. Больш за трыццаць гадоў ён быў вялікім канцлерам, гэта значыць другім чалавекам у дзяржаве пасля самога вялікага князя.

(працяг будзе)

Пакінутае шчаня

Гэта здарылася па дарозе ў лес. Я з сяброўкай выбралася на нашу ўлюбёную паляну ў ляску, што знаходзіцца за нашай вёскай Кашалі. Мы пачулі пісклявы голас, які даходзіў з кустоў ля дарогі. Маленькі чорны сабачка прасіў злітавання. Мы яго пашкадавалі, пагладзілі і пакінулі ў лесе, бо не ведалі, ці нашы мамы дазволяць яго ўзяць дадому.

Вечарам я расказала бацькам пра сабачку і папрасіла ў іх, каб дазволілі мне апекавацца звярком. На жаль, мама не згадзілася. На другі дзень мы з сяброўкай зноў пайшлі ў лес. Шчанюк не пакінуў свайго месца. Плакаў яшчэ больш жаласліва. Я пабегла дадому, прынесла кубак малака і накарміла сабачку. І так мы з сяброўкай некалькі дзён прыносілі паесці чорнаму сабачку, не пакідалі яго, аж да канца канікул. А калі пачаліся першыя прымаразкі, мая мама дазволіла мне яго ўзяць дадому.

Цяпер ён ужо крыху падрос, весела бегае па нашым падворку. Завецца Рэксам!

Наталля Жураўль,
VI кл. ПШ у Орлі

Мудрасць народных назіранняў

Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю.

Кастрычнік зямлю балоціць, а лес залоціць.

У кастрычніку гром — зіма без снегу.

Першы восеньскі снег з завірухаю — прыкмета доўгай восені з частымі снегападамі.

Гусі адлятаюць у вырай — зіму на хвастах цягнуць.

Чорныя воблакі на небе ідуць нізка і хутка — дрэннае надвор'е будзе працяглы час.

Пакровы пакрываюць траву лістам, зямлю снегам, ваду лёдам.

Узнагароды за малюнкі

Кааператыўны банк у Браньску ды яго аддзелы ў Нараўцы, Боцьках, Гродзіску і ў Вышках ды філіял у Рудцы арганізавалі пластычны конкурс для школьнікаў на тэму школьных ашчадных касаў ды ашчаднасці ўвогуле. Удзельнічалі ў ім 186 дзяцей з дзевяці пачатковых школ і адной гімназіі, у тым ліку з Нараўкі, Семяноўкі і са Старога Ляўкова.

Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі ва ўзнагароду шапачкі з лагатыпам банка. У катэгорыі школ першую ўзнагароду — 500 злотых — атрымала Пачатковая школа ў Нараўцы. Школьныя ранцы атрымала дзевяць вучняў, у тым ліку Магдаліна Кандрацюк і Рафал Багнюк з ПШ у Нараўцы ды Паўліна Трусевіч з ПШ у Старым Ляўкове. Найлепшыя вучні з нулявога класа ПШ у Межвіне атрымалі пеналы.

У газеце, якую выдае Кааператыўны банк у Браньску, у 29 нумары апублікавалі найлепшыя рысункі ўдзельнікаў конкурсу, між іншым, Рафала Багнюка, Анны Садоўскай і Магдаліны Кандрацюк з ПШ у Нараўцы ды Крыстыны Ляшчынскай і Камілі Карпюк з ПШ у Старым Ляўкове.

(яц)

За спеў і радасць — пару слоў друкаванай падзякі.

„Асенні ліст” і „Ріма” — дзед з унукам: Аляксей і Раман Карповічы.

Асенні зялёны ліст

Гарадоцкі асяродак культуры (Дом культуры імя Кастуся Каліноўскага) і Гміннае праўленне Саюза пенсіянераў, рэнтыстаў і інвалідаў у Гарадку на ўрачыстае святкаванне пяцігоддзя хору „Асенні ліст” запрасілі цешыцца ўсю ваколіцу. Кіношная зала трашчала ў швах, стракацела народным адзеннем. Пасля кароткіх прамоў гасцей і старшыні праўлення, уручэння грамат публіка аддалася раскошы слухаць прафесіяналаў народнай роднай песні. Маладых, маладых, маладых — бо іншых тутака няма. Маладзюсенькія „Спяваючыя ноткі” з іх былі найбольш статычныя. А амаль паўвечны „Расспяваны Гарадок”, ці самыя юбіляры — што гэта за ўзрост! „Nie do zdarcia!” „Пераживем!” — бадзёра спявалі гарадчанкі, а некаторым слухачам слёзы плылі па тварах.

Сустрэча была таксама нагодай павесяліцца ў грамадзе пры застоллі і спевах. Харысткі заставілі з густам, фантазіяй і досціпам багатыя сталы (чаго там не было!), пераліваліся песні і жарты, бабулі і дзядулі з тэмпераментам пусціліся ў скокі. Быў час і на хвалюючы ўспамін пра таго хто адышоў з сябрыны.

— Гэта так ёсць на вёсцы... — раптам засумаваў Янка Карповіч, адзін з тых, хто пачынаў з „Асеннім лістом”. — Быў час, калі бацькі, дзеці і дзяды былі разам. Гэта будавала пашану да старэйшых, да роднага. А цяпер дзед застанецца ў вёсцы забітай дошкамі, нікому непатрэбнай, бацькі б’юцца як рыба аб лёд, каб хлеб дастаць, а дзеці па вуліцы ходзяць. І ані мовы, ані культуры не будзе. Калісь бацька даў сыну зямлі кавалак, дык ён яе трымаўся. А цяпер усе загледжаны на захад, на дабрабыт, на віртуальныя цуды...

У Гарадку мо і не так кепска. Праўда, непрыемныя пытанні тым „з вуліцы”, што таўкліся без мэты вячэрняй парою „пад культурай” задаваў Мацей Халадоўскі, дапытваючыся пра мову, нацыянальнасць і іншыя такія неістотныя справы. Не разумелі хлопцы закладпачання тым у нетутэйшага чалавека. „Ну, старым дзівакам то можа гэта і варта турбавацца такімі пытаннямі. My jesteśmy Polacy, bo w Polsce mieszkamy!” — дзівілася польскаму журналісту ў акуляры гарадоцкае маладое пакаленне. А той усхваляваны ішоў да вясёлых „старых дзівакоў”, каб яму сіла вярнулася.

„Асенні ліст” пачаўся ў 1996 годзе, досыць спарадычна, як кажа Янка. Пані Геня Матыс арганізоўвала сустрэчы для старэйшых людзей. Пра здароўе гаварылі, курсы арганізавалі. Папрасілі былі Янку, каб пайграў ім на гітары. Узяліся за спевы. З гарамонікам дайшоў Янка Лісоўскі, з якім Карповіч калісьці ў гуртах розных выступаў. Паспявалі раз-другі, падключыліся да пенсіянерскай агранізацыі ды дому культуры. Падвучыліся згодна спяваць, пасля ўзяўся за іх Юрка Астапчук. Паехалі на першыя „выстэмпы”. І сталі заваёўваць публіку, сустракацца з іншымі хорамі і калектывамі, м.інш. крынкаўскай „Пагоднай восенню”. Пачаліся дасягненні, таксама агульнапольскія. Можа таму, што ў праграме мае „Асенні ліст” песні і польскія, і беларускія, і ўкраінскія, і рускія... І ўсё з гумарам. Вось у Быдгашчы, дзе заваявалі першае месца ў краіне, гітам была іх... жартаўлівая песня „На цвінтары ціха нябожчыкі спяць, а музыка ціха ім грае...” Ну, трэба ўмець смяяцца ў тым нешматлікім немаладым гурце (18 асоб — 7 мужчын разам з музыкантамі і 11 жанчын) у наш нялёгкі час. Самім цешыцца і іншым радасць прыносіць.

Міра Лукша
Фота аўтара

На сёлетнім аглядзе калядных калектываў.

На раённым аглядзе VIII Фестывалю беларускай песні.

Мы самі падбіраем мелодыю, часамі мяшаем іх. Мы ж музычнага кіраўніка не маем. (...) А вельмі шкада, што мелодыі не аўтэнтычныя...

„Журавінкі” з Агароднічак

Што падкупляе ў „Журавінак”, дык гэта ахвота спяваць, бываць на сцэне, цешыць сябе і людзей сваім спевам. І адразу вядома, што гэта песні „журавінкавыя”, бо ўсе іх піша ім адна асоба, сяброўка, якая ў хоры не спявае. Яна (Ніна Панкевіч) працуе на гаспадарцы і шмат гадоў ужо нам складае і песні, і калядкі, гавораць харысткі. Напрыклад, на сёлетні конкурс беларускай песні яна напісала нам дзве песні: „Ранняю парою” і „Сонейка свеціць”. А мы ўжо самі падбіраем мелодыю, часамі мяшаем іх. Мы ж музычнага кіраўніка не маем.

Так гавораць пра сябе харысткі. А вельмі шкада, што мелодыі не аўтэнтычныя, а спяваюць яны свае песні на мелодыі іншых песень.

Пры ўсёй сімпатыі да калектыву, здаецца, што жанчыны не ўсведамляюць сабе, які ў каго голас, і менавіта таму цяжка ім заспяваць у шматгалоссі. Патрэбны ім музычны інструктар, хаця б з Супраслі ці з Беластока.

Ствараецца ўражанне, што жанчыны не ведаюць аб тым, што трэба падперці перапонку, што не кожная спявачка можа заспяваць высокую ноту, а стараецца заспяваць яе сілком, стараючыся раўняцца да іншых. Ну, кажу, бракуе ім прафесійнай парады. Нехта павінен расставіць іх галасы.

Жанчыны з калектыву (як і было, кажуць, дзевяць асоб) цешацца, што ёсць прынамсі дзе праводзіць рэпетыцыі. Збіраемся ў клубе, кавярню, расказваюць яны, пакінулі, хаця спачатку забралі ўвесь будынак. Агароднічкі паставіліся: мы будавалі, у нас калектыў. Цяпер там чысценька, адрамантавалі.

І так спяваюць яны ўжо дваццаць трэці год. Ёсць ужо цяпер прыгожыя касцюмы, во каб так яшчэ інструменты дадаць, мараць яны.

Думаю, аднак, што перш за ўсё „Журавінкам” патрэбна фаховая дапамога.

Адрыяна Семянюк
Фота Сяргея Грынявіцкага

Лясная звярына паказваецца ў натуральнай абстаноўцы.

Закончылася перабудова музея, канферэнцыйнай залы і рэстарана.

Можна наведваць музей

Закончылася перабудова Прыродазнаўчага музея ў Белавежы, рэстарана, будова канферэнцыйнай залы, ідзе рамонт спалучанага з імі гатэля. Зараз у музеі знаходзяцца часовыя выстаўкі звярыны і птушак Белавежскай пушчы ды мастацкіх прац удзельнікаў Белавежскіх мастацкіх сустрэч.

— Трэба цешыцца, што знайшліся сродкі, каб выратаваць ад знішчэння стары музейны будынак. Перабудова будынка Прыродазнаўчага музея, рэстарана і будова канферэнцыйнай залы каштавалі каля 5 мільёнаў злотых. Трэцюю частку сродкаў атрымалі мы з Кантракту для Белавежскай пушчы і па столькі ж грошай ад Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі ды „Экафонду". Вярнуліся ўжо амаль усе нашы экспанаты, вывезеныя на час рамонту з Белавежы. Толькі частка нашых птушак знаходзіцца яшчэ на выстаўцы „Птушкі свету" ў Растачанскім нацыянальным парку. У наступным годзе гэтая выстаўка будзе паказвацца ў нашым музеі і гэтым самым нашы птушкі вернуцца, — заявіў намеснік дырэктара Белавежскага нацыянальнага парку Багдан Ярашэвіч. — Ёсць у нас сродкі ды аб'яўляем конкурс на выкананне пастаянных выставак, плануем, што з 2003 года наш музей пачне працаваць з гэтымі менавіта выстаўкамі. Зараз за свае сродкі рамантуем гатэль і з-за недахопу грошай рамонтныя працы крыху адтэрміноўваюцца.

Пастаянная выстаўка будзе размешчана ў музеі ў дзвюх выставачных залах на плошчы каля 1 500 кв. м, дзе зараз часова, бо да канца гэтага года, знаходзіцца частка даўняй музейнай выстаўкі. У зале на другім паверсе знаходзяцца звяры і птушкі Белавежскай пушчы, пчалярскія прылады і калоды, якімі карысталіся бортнікі. Звярына паказваецца ў адмысловай сцэнаграфіі, выглядам набліжанай да лесу.

— Цяперашняя выстаўка звярыны і птушак яшчэ не задавальняе турыстаў, бо яна невялікая і мала эфектная. Каб паказаць лясныя ўмовы, павесілі мы вайсковую маскіровачную сетку, але пастаянныя выстаўкі будуць выглядаць інакш, — паінфармаваў супрацоўнік музея Пётр Байко.

Часовыя выстаўкі будуць змяшчацца побач канферэнцыйнай залы на 172 асобы. Цяпер у зале часовых выставак вісяць графікі ўдзельнікаў Белавежскіх мастацкіх сустрэч, якія адбыліся летам мінулага года. Раней знаходзіліся там фатаграфіі Анджэя Таркоўскага. З канца красавіка, калі пачала працаваць выстаўка звярыны і птушак, наведалі яе каля 36 тысяч турыстаў. У канцы мінулага навучальнага года сярод наведвальнікаў музея найбольш было вучняў, а летам пераважалі замежныя турысты.

— Пастаянная выстаўка будзе ладзіцца сярод натуральнай сцэнаграфіі, фонам будуць велізарныя фатаграфіі, дрэвы і лясная абстаноўка. Звярына і птушкі прадстаўлены будуць у руху, напрыклад, будуць паказаны ваўкі, якія гоняць аленяў і таму можна будзе выкарыстаць толькі частку старых экспанатаў. Каб выстаўка была больш эфектнай, скарыстаем святло шматлікіх лямпаў. Дазволіць гэта паказаць наведвальнікам цікавыя дэталі і зрабіць выстаўку больш арыгінальнай, — заявіў захавальнік фондаў музея Пётр Галіцкі.

Неўзабаве на выстаўцы ў Белавежскім нацыянальным парку будуць прэзентавацца фатаграфіі „Лес у маім аб'ектыве" — пра нацыянальныя паркі ў Польшчы.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Шчасце

Не было ў нас працы ў гміне. Ні вучонаму, ні нявучанаму. Хоць ты павесся. Наўкол пушча. Цягнікі паадмянялі. Школы ліквідуюць, усіх дзяцей пазаганялі ў новую гмінную гаргару на ўскраіне мястэчка. Нават пушчу зачыняюць — людзі ў плач ударылі: ні ягады, ні грыба цяпер нашага не будзе! Варшавякі, еўрапейцы хочуць мець свежае паветра, а нам — хоць падушыся пад старажытнымі дубамі. Ды мне пашанцавала. Мо таму, што не цуралася і чорнай работы. Што там студыі ды матуры — пайшла я мыць-шараваць нямоглых старэчаў, як звычайная сястра гміннае дапамогі. Дзесяцём беспрацоўным прапанавалі гэта рабіць, а толькі я не баялася. Усе чакалі работу ў гміне — чыстую, „папярковую". А войт пасля выбраў мяне да тае працы, ужо ў гміннай канторы. А ў гміну прыйсці патрабуючаму трэба. Хочаш грошы, бедалага — дакоцішся ў „апеку" хоць на палачцы. Але ж і ў глыбінку далей дабірацца нам, чыноўнікам, трэба, паглядзець, як жывуць падапечныя. На ровары да іх едзеш, пешшу шлэпаеш, калі машыны не маеш. А дарогі разбітыя! Ды я не пра дарогі, і нават не пра агульны маразм у нашай прыпушчанскай гміне. Я пра шчасце хачу напісаць. Бо ж і чытачу хочацца весялейшага.

Набыла я ўрэшце разбіты „Форд". Была я Марынка без машыны, стала шчаслівай уласніцай аблупленага аўто старой мадэлі. Ездзіць. А людзі глядзяць, здаецца, зайздросцяць: во, Марынка мае аўтамабіль! Відна, добра зарабляе. Еду па вёсцы, усе сабакі ды каты — пад паваленыя платы разбягаюцца. Катоў ды сабак, здаецца, больш сёння чым жыхароў. Ведаю дэмаграфію, у суседнім кабінеце месціцца ў нашай гміне загс. Ды я не пра дэмаграфію, бо ж гэта не публіцыстыка. Я пра шчасце.

Прыехала я аднойчы ў вёску М., наведаць адну нашу старажылку. Бабуля ўжо не гаспадарыць, трохі корпаецца ў агародчыку, сагнёная ў крук. Наведвае яе радня ці не з Варшавы. Вядома, далёка. А на падворку ў яе — плойма сабак. Падбеглі да брамкі, аж заходзяцца. І малыя, і вялікія, што ледзь брамку не пераскочаць. Добры дзень, сабакі, кажу ім, а яны — ужо ўсе ў сабачых усмешках. Вітаюць мяне, значыць. Выйшла бабуля на сцежачку, з ёю варшаўская кузіна. Ратаваць неспадзяванага госця ад злоснае зграі.

— Бачу, пані Марынка, што вы такі добры чалавек, — азвалася варшаўская бабуліна пляменніца. — Бо ж сабакі ведаюць! Хачу я вам падарыць нашу Азу, шчанюка. Я прывезла яе да цёткі, ды ў яе столькі гэтых цюцек! Яна, Азачка, маленькая...

І ашчаслівілі мяне напаўпародзістай сучачкай. Прывезла я тую Азу дахаты, а муж у злосць кінуўся: сучка!!! Да таго „крыжаванка" з дзвюх аўчарак — нямецкае пароды ды каўказскае. Можаце ўявіць сабе, што з яе вырасла. Сабачыска на ўсю ваколіцу. А вялікі сабака, да таго мой, хоць патрапаны, аўтамабіль, дадаюць мне аўтарытэту ва ўсёй гміне. І як тут не быць шчаслівай!

Марына Лясная

Вачыма паляка

... адкуль мой род

Бабця мая выхавана была ў глыбока каталіцкай радзіне. Так моцна глыбокай, што ўжо змоладу „абрыдлі" ёй каталіцкія духоўнікі. Нават перад смерцю, прымушаная шпітальнымі лекарамі і ксяндзом да згоды на аперацыю, ледзь падымаючыся на схуднелых руках, пакрыквала: „Не будзеце вы мне казаць, што ў маім сэрцы няма Бога. Не ўлазьце паміж нас!" Колькі дзён пасля памерла, у болі, прытрымліваючы маю далонь, без ксяндза.

У апошнія гады штотыдзень я быў прымушаны ёю слухаць папскія набажэнствы ў тэлебачанні. Бабця ў іх услухвалася. Недачувала, дык папскія словы прабіваліся ў мой пакой хочаш не хочаш. Пробашча, што хадзіў па калядзе, праганяла, калі спрабаваў праз сілу пераступіць парог кватэры і з дакорам дапытвацца „А вы наканец дык хто, нашы, ці мо праваслаўныя?" Як толькі ў тэлебачанні паявіліся праваслаўныя святочныя набажэнствы, музыку ў маім пакоі заглушвала „Госпадзе памілуй", што далятала з тэлевізара па-суседску.

Бабця гаварыла па-свойму. Шчанючку, якую я купіў ужо пасля бабулінай смерці, я назваў Путка. Не ад іспанскага ці італьянскага (Пута, Путана) — як хочуць мае польскія сябры — але ад бабцінага „ты страхапуце". Так вось казала, калі прыходзіла ў мой пакой блізка сорак гадоў таму, калі перад сном я не хацеў заставацца адзін. Ксяндзу, таму, што яго выганяла, кідала: „A poszed w kibienimaciery" (вось так).

Прагна заядалася тлустай капустай з кавалкамі вэнджаніны, селядцом з цыбуляй і вялікай алівай. Картоплі метрамі залягалі склеп да позняй вясны. Заўсёды мусіў быць запас запалак, воцату і солі. Трыццаць гадоў таму яе „працаўнічы" ўчастак быў бульбянішчам. Пазней — у эпоху беластоцкага паскарэння — расквітнелі на ім градкамі буракі, морква, а нават радыска-лядзяш і кветкі.

На бабуліна пахаванне прыйшлі дзве суседкі.

— Панава бабця дык пра нікога злога слова не сказала, — гаварылі спачувальна.

Адна з іх, Вольга, штонядзелю ходзіць да святога Мікалая. Другая, Галена, да Успення Найсвяцейшай Марыі Панны. Не сказалі суседзям, што ні папа, ні клехі на пахаванні не было. Пры жыцці бабця падкідвала ім ля дзвярэй зеляніну са свайго ўчастка. Быццам бы тая гародніна ўзялася там невядома адкуль.

Шмат гадоў таму Эдвард Рэдлінскі паўтараў ды паўтараў маёй маме:

— Ты з беларусаў.

Мама ўсміхалася.

— То ж ты з-за Супраслі, з тых... -ічоў, — працягваў Рэдлінскі. — Ну і што? Я таксама беларус. Усе мы тут беларусы.

Мама ўсміхалася, Рэдлінскі паліваў савецкае ігрыстае. Хтосьці падхопліваў: „W bandzie żyła Murka, dziewczę czarnookie. Los ją przygnał nie wiadomo skąd, więc czuwała banda nad jej każdym krokiem, naprawiając najdrobniejszy błąd".

Мацей Халадоўскі

Два гады ў баўэра

Успамінае Пётр СТЭЛЬМАШУК з Вулькі-Тэрахоўскай, народжаны 10 лістапада 1923 года ў Каленкавічах.

Два разы прысылалі павестку, каб у Нямеччыну збірацца. За першым разам на фурманцы ў Вярховічы завезлі. Пасля пехатою ў Высокае ішлі. За намі не наглядалі. Я тады і шмыгнуў набок з двума калегамі. Два тыдні хаваўся. Калі бацьку другую павестку прыслалі, рашыўся ставіцца на прызыўны пункт.

Гэтым разам калону немцы з сабакамі з абодвух бакоў абставілі. На станцыі пагрузілі нас у таварныя вагоны і адправілі ва Усходнюю Прусію. Было гэта ў 1942 годзе.

Апынуўся ў Георгенфорсе. Са зборнага пункта ў вёску на фурманцы прыехаў з дачкою Артура Фрыдрыца. Ён аказаўся маім панам. Гаспадар небагаты быў: чатыры кані, пятнаццаць кароў і статак свіней.

У баўэра, апрача жонкі і дачкі, працаваў наёмны работнік, паляк Зыгмунт. Я прыехаў у час сенакосаў. Якраз сена з поля прывезлі. Калі гаспадар выпрагаў коней, я прысеўся на лаўцы. Падышоў ён да мяне і прывітаўся. Па-нямецку штосьці загаварыў, але я зразумеў толькі два словы „польныш" і „русіш". Мне здавалася, што пытаў ён, хто я такі. „Рускі", — адказаў я яму. Ён усміхнуўся і па плячы мяне паляпаў.

У аборы была маленькая каюта, у якой мы з Зыгмунтам кватараваліся. Ад світання да змроку працавалі ў полі. Гаспадары аказаліся ветлівымі людзьмі. Кармілі добра, нічога не шкадавалі. Запамяталася такое здарэнне. З пошты паведамілі, што для мяне надышла пасылка. Гаспадар кажа: „У Кройсінген еду, пасылку прыхвачу".

Так і было яно, але пан Фрыдрыц на мяне з кулакамі накінуўся, як з горада вярнуўся. „Ты што, у бацькоў прадукты просіш, — гаварыў усхваляваны. — Ежы табе не хапае? Дык чаму мне не гаворыш?!."

Я тлумачыў, што гэта памылка, бо дамоў ліста не пісаў і пасылку не прасіў. Бацькі самі прыдумалі. На наступны дзень на абед падвойную порцыю прынеслі. У пачцы бацькі даслалі бохан пірага, сала і свойскую каўбаску. Як рэзаў пірог, дык аказалася, што ў бохне бацька бутэльку самагонкі схаваў.

З гміны ад баўэра патрабавалі вярнуць лішняга работніка, паколькі гаспадарка была невялікай. Здавалася, што мяне адашле, але выбраў Зыгмунта. Незадоўга дзяўчыну запатрабаваў. Прыслалі палячку з-пад Беластока — з Бацютаў, здаецца.

Два гады працаваў я ў Артура Фрыдрыца. Фронт падыходзіў і мясцовым баўэрам паступіў загад збірацца выязджаць. Рускіх баяліся. Мой работадаўца не думаў з месца кранацца, але прымусілі. Пагрузіліся на дзве фурманкі. На адной мы селі, а на другой багаж паклалі. Больш за сто пяцьдзесят кіламетраў ехалі, а начавалі ў прыдарожных забудовах, бо на дарозе баяліся заставацца. Спалі на фурманцы. Харчаваліся тым, што з дому забралі. Спыніліся мы непадалёк Кёнігсберга. Немцы заставілі акопы капаць. Як рускія пайшлі, дык немцы паўцякалі. Я застаўся з іншымі работнікамі. Рускія вайскоўцы дапытваліся, хто мы такія і як трапілі да немцаў. Страшна гэта выглядала. Трымалі нас у ямках вымураваных у аборы. Зверху прыкрылі брызентам. Цемра залягала. Выпускалі толькі за сваёй патрэбай. Ежу прыносілі два разы ў дзень. Дрэннае харчаванне было. Два тыдні, дзень у дзень дапытвалі: хто такія, як да немца трапілі. На канец загадалі ў калону фарміравацца ды ўперад ісці. Ніхто не ведаў куды. Салдаты трымалі ахову. Хто рашыўся набок адскочыць — стралялі. Дайшлі да нейкага горада, у лагер для палонных. Зняволеныя працавалі ў фабрыцы мэблі. Нам загадалі мэблю на вагоны грузіць. Пайшлі чуткі, што ўсе з Беласточчыны дамоў могуць пайсці. Збіраліся групамі. Ішлі пехатою. Кампанію ў падарожжы двух салдатаў састаўлялі. Пільнавалі, каб у дарозе прахадзімцы не пакрыўдзілі. Дайшлі ў Беласток. Там даведаўся, што польска-савецкая граніца ўстаноўлена. А як спыніўся на начлег у Кляшчэлях, дык гаспадар сказаў, што мая вёска Каленкавічы на другім баку граніцы знаходзіцца. На паўгода я ў Полаўцах затрымаўся. Там мясцовым людзям у гаспадарцы памагаў, затым у Чаромху падаўся. У 1947 годзе пазнаёміўся з Марыяй, дзяўчынай з Вулькі-Тэрахоўскай. Неўзабаве вяселле згулялі. Сям'ёй абзавёўся і па сённяшні дзень тут жыву.

Запісаў Уладзімір СІДАРУК

Прэйскурант дзеда Канстанціна

Успаміны выклікаюць розныя пачуцці — і смех, і слёзы. Тое што прайшло, ніколі не вернецца, аднак памяць пра гэта застанецца. Канстанцін Стэмпняк з Браньска, 80-гадовы селянін вельмі добра памятае колішнія цэны прадуктаў.

„Калі мне было 6 гадоў, бацька часта забіраў мяне з сабою на кірмаш у Браньск. Добра памятаю выгляд тадышніх яўрэйскіх крамаў.

Запалкі каштавалі тады 2 гр., кілаграм цукру — 1 зл. 10 грошаў, соль ад 70 да 90 грошаў.

Карову можна было купіць за 100 злотаў, а за малако за месяц мой бацька атрымліваў 45 злотаў ад адной каровы. За каня да 2 гадоў трэба было заплаціць 200 злотаў, за жарабя да 1 года — 45-50 злотаў. Бывала аднак і так, што прыходзілі яўрэі і куплялі жарабя, якое ледзь што нарадзілася. Тады душылі яго і лупілі скуру, за якую плацілі 50-60 злотаў дык і гаспадары прадавалі жарабят, бо гэта ім лепш аплачвалася, бо і карміць, і даглядаць не трэба было. Скура жарабяці была лёгкая, мяккая, гафрыраваная. Тады зімы былі марозныя і калі людзі ездзілі фурманкамі кудысьці далей, лёгкае футра ахоўвала ад холаду. Праўду кажучы, такія футры былі вельмі дарагія і каштавалі 70 злотаў.

Збожжа тады не было дарагое, за цэнтнер жыта плацілі 10 зл., а пшаніцы — 15 зл.

Памятаю, што восенню я разам з сястрой збіраў яблыкі і насіў на гарышча. Там мы іх роўна раскладвалі на саломе. Яблыкі гнілі, а потым маці саджала іх у печ і сушыла. Зімою вечарамі мы жавалі іх гадзінамі, як цукеркі. Часам бацька прыносіў сахарын, аднак потым хіба забаранілі яго прадаваць, дык і асталіся мы без салодкасцей. Таксама маці сушыла буракі і грушы.

Маці з сястрою часам ездзілі за пакупкамі, але толькі ў адну краму — тэкстыльную да яўрэя Ізмаэля па матэрыялы. Заязджалі туды рэдка, бо цэны былі вялікія і людзі самі ткалі і шылі адзенне, бо грошай не збывала".

Паўліна ШАФРАН

Амаль панам не стаўся

2. Марозы не загінуць

Не стаў мой дзед Мірон панам, у роднае Старабераза вярнуўся. Адмяніць ён свае мужыцкае долі не змог. Зноў за гаспадарку ўзяўся. Пляваўся не раз на тых палякаў, што яго з маёнтка выгналі, наракаў. Што ж, зноў трэба было брацца за працу ўсёй сям'ёй. Яшчэ ім і сын адзін нарадзіўся, Грышам яго назвалі. Але ж „дзіцячы варштат" трэба было на падстрэшша схаваць. І так рады ледзь давалі. Але гады ішлі, дзеткі падрасталі, не ўбачыш і калі. А чаго да жыцця патрэба? Крыху грошай, здароўя крыху. Штодзённы кавалак хлеба каб быў, і каб да хлеба было. Каб жыццё было спакойнае і прыгожае...

Аднак на ўсіх нас збіралася з захаду варожая сіла. З кожным годам сталі людзі немца больш баяцца. Куды ж ад яго ўцякаць, як ад яго схавацца? Можа, свету канец прыйшоў? Прапаганда так у галовах закруціла: збіраць трэба ўсё і ў глыб Расіі падавацца. І так бежанства і маіх дзядоў кранула з заседжанага, добрага месца. Дзякуй Богу, недалёка яны са сваім сціплым дабыткам заехалі. Немцы на Свіслачы мост узарвалі і загадалі ўсім назад вяртацца. Яны хутка вярнуліся, а шмат каму з нашых людзей тая вайна і бежанства лёсы пакарабачыла. Што ж, вярнуліся. За гаспадарку ўзяліся. Чалавек забывае аб клопатах і цяжкасцях. А тут новая чутка пайшла ў народ — Расію рэвалюцыя зварухнула. З трону скінулі цара. І раструбілі, якое райскае жыццё будзе, калі бальшавікі стануць панамі, усё для рабочых і сялян будзе. Некаторыя чулі тое, што хацелі чуць: працы будзе мала, а бяды ніякае. Дык як не чакаць такога раю? Былі такія, што пакінулі сваю вёску, пабеглі туды. Тое ж пазней сталася з маім дзядзькам Грышам. Саветаў ніяк не дачакаўся. І калі дваццаць гадоў скончыў, сам да іх падаўся. І дзе сваё жыццё даканаў? Ніхто не ведае. У дзедкі дзве дачкі засталіся і трох сыноў. Прыйшлося дзедавай сям'і ўсяго нажыцца. Кожны дзень ад Грышы вестачку чакалі. Ці забілі хлопца на граніцы, ці памёр ён у вязніцы, ці мо ў Сібір яго пагналі? Пра нішто нашым не сказалі. Дзед рашыў ужо нікуды са свайго дому не выбірацца, іншай долі не шукаць. Ды пасля страты сына і жонку сваю пахаваў. Дзед замаркоціўся, галаву павесіў. Як сябе не суцяшаў, як не разважаў, дык рашыў другі раз у сваты пайсці. Ажаніцца на гвалт трэба, гаспадарку весці, дзеткам апеку даць. Ды цяжка сваю дарагую Таццяну забыць... Ды калі няма кабеты ў хаце, няма і дому. Трапіў дзед Мірон на добрую жанчыну. Дзеду жыццё адмяніла, дзеткам мамку замяніла. Стаў дзед жыць, далей планаваць, як сваё жыццё палепшыць, што яшчэ прыдбаць. Як дачок замуж пааддаваць, сыноў добра пажаніць. Не ўбачыш, і калі прыходзіць пара, калі дзеткі выходзяць з бацькоўскага двара...

Надыходзілі трыццатыя гады XX стагоддзя. Якія гэта былі гады! Усё ў гаспадарцы ўручную рабілі. Вось мачыха хлеб пячэ, дзеткі ранкам утраіх жорны круцяць. Колькі таго хлеба трэба! — сям'я ж вялікая. Калі мачыха ў вялікай дзяжы хлеб расчыняла, дапамагаць сабе клікала трох пасынкаў. Працы было шмат, бяды і няшчасця. Аднак не наракалі людзі, больш у царкву хадзілі, Госпаду маліліся. Жыццём цешыліся. Добра жылося, калі пад дастаткам было хлеба. А ў дзедкі — капа жыцця, старасць не за гарамі. Паміраць яшчэ не хочацца. Колькі спраў засталося! Гаспадарку падзяліць, кожнаму дзіцяці дагадзіць. Каб спрэчак паміж імі не было. Найперш дзед Івана ажаніў — у сваёй вёсцы жонку знайшоў. Там, дзе Іван пасяліўся, быў пусты агарод Нікіфара Калыбкі. Пайшлі былі за той агарод судзіцца, Калыбка справу прайграў, хоць за ім рацыя была, ды не грошы. Паставілі на тым месцы хату Івану. Цётка Ганна ў вёску Ягаднікі пайшла. Мой бацька Мяфодзій знайшоў дзяўчыну ў сваёй вёсцы, Анастассю, і па волі Божай яна мне маткаю стала.

А было гэта не адразу так. Мой бацька добрым чалавекам быў, хай яму зямелька пухам будзе. І ніхто яго кепскім словам не ўпамяне. Калі да жаніцьбы дарос, закахаўся ён быў у аднасяльчанку Харыціну. Толькі выйшла з таго ўсяго адна бяда. Пакахаў яе яшчэ адзін хлопец, зусім адрозны характарам ад Мяфодзія. Дзе толькі той супернік не бываў, чаго толькі не рабіў! І рашыў пазбыцца Мяфодзія. Аднойчы пабіліся на танцах хлопцы, і Харыцінін кавалер данёс, што гэта ўчыніў Мяфодзій Мароз. На судзе пад прысягай свае словы пацвердзіў. Год „адсядкі" Мяфодзію за нішто далі. У турме вывучыўся сталярскаму рамяству. Гэты фах яму ў жыцці вельмі прыдаўся. Калі ж з турмы вярнуўся, насмяялася над ім жыццё. У людзей пашану страціў. Дзяўчына ад яго адвярнулася. Самы цяжкі быў для майго бацькі трыццаць пяты год. У трыццаць шостым ён ажаніўся, жонку з варожай сям'і ўзяў — шмат гадоў судзіліся за агарод, які дзед Мірон забраў. Толькі каханне маладых паяднала сем'і Нікіфара і Мірона, што сватамі сталі. І з таго кахання і я ў трыццаць сёмым нарадзіўся. Вялікая радасць была ў хаце, што Марозы не загінуць.

(працяг будзе)

Грыша МАРОЗ

Актыўныя сеніёры

Нараўчанская гмінная арганізацыя Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў — адна з самых актыўных у Падляшскім ваяводстве. Цяпер дзейнічае пад кіраўніцтвам Ядвігі Карпюк з Нараўкі. Налічвае больш двухсот членаў.

Сёлета праўленне арганізацыі людзей „трэцяга ўзросту" арганізавала ўдалыя танцавальныя вечарыны з конкурсамі і іншымі атракцыёнамі, а таксама экскурсіі, між іншым, у Драгічын, на Святую Гару Грабарку ды ў Музей сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы. Чарговае мерапрыемства — гэта святкаванне Дня сеніёра, якое адбудзецца 30 кастрычніка. У канцы лістапада запланавалі адсвяткаваць „Анджэйкі".

У маі г.г. у Нараўцы наладзілі раённы агляд песенных калектываў сеніёраў. На ім вельмі добра зарэкамендавалі сябе стараляўкоўскія „Цаглінкі" і яны прайшлі адбор на ваяводскі агляд, які адбыўся ў Саколцы 16 верасня. У катэгорыі фальклорных гуртоў „Цаглінкі" заваявалі першынство і ў 2002 годзе будуць удзельнічаць у краёвым аглядзе ў Быдгашчы.

Варта адзначыць, што пенсіянерам шмат дапамагаюць войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч і дырэктар Гміннага асяродка культуры Андрэй Скепка. Сваё бюро пенсіянеры маюць у Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы, у якім арганізуюць забаўляльныя мерапрыемствы.

(яц)

Голасу — злот цану!

Наша грамадства бударажаць заробкі рознага варшаўскага люду. У апошні час, у сувязі з парламенцкімі выбарамі, на парадку дня сталі аклады парламентарыяў, нашых абраннікаў. Людзі абураюцца іхнымі адносна вялікімі акладамі, а тое абурэнне ўзмацняюць некаторыя з саміх абраннікаў што і раз згадваючы пра патрэбу іх змяншэння. Асаблівай драматургіі гэтае пытанне набрала сёння, калі дзяржаўны бюджэт амаль смяротна знясілены дэфіцытам. Адным са сродкаў пагашэння казённых недахопаў мае быць ці то абмежаванне колькасці парламентарыяў, ці то абмежаванне іх акладаў. Я прапаную іншае рашэнне гэтай праблемы, якое амаль поўнасцю вызваліць дзяржбюджэт ад парламенцкіх асабовых затрат.

Прапаную я менавіта, каб парламентарыяў заміж казны аплачвалі самі выбаршчыкі — дазволіць гэта грамадзянам, а нават прымусіць іх, намнога лепш азнаёміцца з працай сваіх абраннікаў. Бо цяпер выбаршчыкаваму голасу — грош цана! Калі красавіцкі плацеж падаткаў не прымушае простых людзей знаёміцца з далейшым лёсам іхніх грошай, тады я прапаную ім глянуць на тыя ж грошы з іншага напрамку і больш дэталёва.

Прапаную я вось, каб ад кожнага выбаршчыка спаганяць па адной залатоўцы ў месяц на кожнага з абраных ім парламентарыяў. Па меншай меры каштавала б гэта дваццаць чатыры злоты ў год — менш, чым білет на канцэрт у не надта камунікатыўныя філармонію ці вытанчаны тэатр, затое дастаўляла б намнога больш вельмі канкрэтных хваляванняў. А самае важнае — грамадзяне былі б у гэтым выпадку добра асвядомлены, на якую справу выклалі, разам з выбарчым бюлетэнем, свае грошы і добра мазгавалі б, каму даверыць свае выбарчыя надзеі; не тое, што цяпер, калі людзі часта аддаюць свае галасы на невядомых асобеняў толькі таму, што ўяўляецца ім, быццам вядомыя ім — гэта толькі хапуны або хітруны. Калі так выбаршчык з разок-два зваліцца з агню ў полымя, тады мо менш стане захапляцца сінімі прайдзісветамі.

Каб устанавіць ад каго каму пералічваць тыя залатоўкі, бюлетэні не былі б ананімныя, як дагэтуль, але персаналізаваныя асабістым нумарам PESEL і нумарам падаткавай ідэнтыфікацыі NIP. Пасля галасавання бюлетэні траплялі б у Нацыянальны банк, які вызначаў бы, колькі якому парламентарыю пералічваць залатовак і колькі ад якога выбаршчыка спаганяць іх. Першая справа простая: абранец атрымліваў бы столькі залатовак, колькі набраў галасоў. З выбаршчыка спаганялася б столькі залатовак, на колькіх кандыдатаў аддаў ён свае галасы. Цяпер гэтыя колькасці абмежаваныя да аднаго пасольскага месца і некалькіх — у нашым ваяводстве ад аднаго да трох — сенатарскіх. У будучыні можна зняць гэтае абмежаванне, каб кожны ахвотны, па меры сваёй шчодрасці, мог падтрымаць любую колькасць сваіх любімцаў. Грошы спаганяліся б ад плацельшчыка: працадаўцы або ЗУС. Грамадзяне без плацельшчыкаў не галасавалі б, што — з аднаго боку — пазбавіла б права голасу ўсіх абібокаў і — з другога боку — прымусіла б парламентарыяў да сапраўднага змагання за развіццё эканомікі і рост працоўных месц (і за вынікаючыя з іх пазнейшыя галасы) заміж пустой балбатні пра змаганне з беспрацоўем. Ухіл ад галасавання не ўхіляў бы спагнання ў плацельшчыка: з такога спаганялася б мінімум — два злоты (па адным сеймавым і сенатарскім); грошы тыя пералічваліся б у спецыяльны фонд, напр., фонд зімовай алімпіяды ў Закапанэ. У той жа фонд пералічваліся б залатоўкі кіраваныя на тых кандыдатаў, якія не прабіліся б у парламент.

Прапаную таксама зняць юрыдычную некранальнасць парламентарыяў, каб злачынцы не шукалі ў вярхоўным заканадаўчым органе прытулку і не ўплывалі там на ўвод спрыяючага грамадскай паталогіі заканадаўства; спасылаюся тут і на польскі, і на італьянскі казусы. Дэпутаты, асуджаныя па крымінальным кодэксе, траціл б свае мандаты, а іх аклады пералічваліся б у згаданы раней фонд. Новых дэпутатаў на іх месца назначаў бы заступнік публічнага інтарэсу з ліку вядучых футбольных снайпераў, або фіналістаў відовішча „Big Brother"; гэтая мая прапанова, як паказвае апошняя выбарчая практыка, заканамерная. Паколькі за новымі парламентарыямі не ішлі б галасы выбаршчыкаў і звязаныя з імі залатоўкі, іх аклад — велічынёю сярэдняй зарплаты медсясцёр і настаўніц — выплачваў бы бюджэт назначаючага заступніка. Назначанаму нельга было б адмовіцца: адмова лічылася б такім жа злачынствам, як здрада дзяржаве або дэзерцірства.

Прапаную таксама, каб устанавіць парламентарыям абавязак штогадовых масавых сустрэч з грамадствам. Паколькі парламент выбіраецца на чатыры гады, кожны дэпутат праводзіў бы чатыры такія мерапрыемствы. Адбываліся б яны ў крайніх павятовых цэнтрах ваяводства, у якіх парламентарый прапісаны на пастаяннае жыхарства, спярша ўсходнім, а далей у чарговых з ходам сонца; у нашым ваяводстве былі б гэта Саколка, Сямятычы, Ломжа і Сувалкі. Парламентарый гарантаваў бы ўдзельнікам мітынгу пачастунак з гарачых каўбасак (мін. 100 г.) з безалкагольным півам, якое прапануецца ў рэкламах нашага тэлебачання (мін. 0,5 л.). Патрабаванае задавальненне ўдзельнікаў сустрэчы сцвярджаў бы звод паліцэйскіх і медыцынскіх пратаколаў. Да часу правядзення задавальняючага мітынгу дэпутат не меў бы права карыстацца сабранымі ад часу выбараў або апошняга фэсту на яго рахунак у Нацыянальным банку грашыма!

Цяперашняя выбарчая практыка прывяла да тупіковай апатыі грамадства і яе накіраванне ў цалкам новы бок можа ўзбудзіць жыццядайны штуршок. Думаю, што мая прапанова выходзіць у напрамку перш за ўсё задавальнення выбаршчыкаў і іхных абраннікаў не толькі ў палітычным, але і бытавым сэнсе. Спадзяюся на грамадскае адабрэнне прапановы ды вывучэнне і ажыццяўленне аўтарытэтнымі ўстановамі.

Палітыкан

Вер — не вер

Мне, Астронку, прыснілася, што я рыхтуюся да нейкай гасціны. Быццам мелі прыехаць да нас далёкія сваякі. Я бачу вялікі стол, які стаіць на нашай кухні, а на ім шмат страў, якія я ўжо пачала рыхтаваць. Але перш за ўсё на ім было шмат змеленага мяса, якое я ўжо паспела прапусціць праз мясарубку. Гэта была свініна. Бачу, што ёсць жылкі белага тлушчу ў гэтай кучы мяса. Божа мой, а я ж з яго хацела зрабіць татарскі біфштэкс, які рыхтуюць у нас з ялавічыны, ды і то зусім нятлустай...

І ўжо я стаю ля другога стала, дзе раблю тыя татарскія біфштэксы — кругленькія, як і трэба — з ялавічыны. Прыгожыя! І раптам бачу: з аднаго тырчыць пук валос, быццам адрэзаных ад конскага хваста, чорнага колеру. Божа, як жа яны трапілі ў мяса?! Мне робіцца млосна. Баюся хваробы. Што будзе, Астроне?

Ядзя

Шаноўная Ядвіга! Ты крыху ўжо і сама адгадала свой сон. Мяркую, што чытаеш нашу рубрыку „Вер — не вер" і адтуль навучылася разгадваць сны. Сапраўды мяса сніць (у тваім выпадку) нядобра. Іншая справа, калі б табе прыснілася, што ясі ці прынамсі бачыш варанае мяса. Гэта абазначала б, што ўсё ў цябе будзе ў парадку, так, як ты б хацела і запланавала.

На жаль, табе прыснілася сырое мяса, цэлая куча яго, а яшчэ горш, што гэта было не тое, што табе было патрэбна і што ты запланавала на тую гасціну падрыхтаваць. Усім жа вядома, што ў нас татарскі біфштэкс робяць не з каніны (як татары), а з нятлустай ялавічыны. А ты ўбачыла змеленую табою гару свініны з тлушчам. Мяркую, што нейкія твае планы не здзейсняцца.

Бадай, нешта ў цябе зменіцца і ты ўсё-такі будзеш задаволена. Сама бачыш, што ты пасля стаяла ўжо каля другога стала і мяса было як трэба — з ялавічыны, а да таго — прыгожыя біфштэксы ў цябе выйшлі. Але ізноў нічога ў цябе не выйдзе з тваёй надзеі: той пук валос, які тырчаў з аднаго біфштэкса, быццам з конскага хваста, так, што табе нават у сне зрабілася млосна, сведчыць, бадай, аб тым, што ты будзеш змагацца з нейкай хваробай, але, на жаль, са зменлівым шчасцем. Жадаю табе моцнага духа і сілы дзеля гэтага змагання.

Астрон

Пасля выбараў

Апошнія выбары ў Сейм і Сенат у нашай краіне бліскуча выйграла лявіца; інакш — посткамуністы. Адразу аднак магу супакоіць кожнага чытача „Нівы", што такія камуністы не страшныя, як бальшавікі перыяду Яжова, Берыі і пазнейшых правадыроў за мяжою. Наша лявіца мае дух Захаду і будзе выконваць кожны найменшы загад адтуль; інакш: будзем надалей жыць пад дыктоўку Амерыкі, Англіі, Германіі, Бельгіі... Наша лявіца з'яўляецца лявіцай толькі на паперы, а ў сапраўднасці яна адным мірам мазана, што і адышоўшыя з трэскам. Адны нажыліся, дык і тыя, што будуць правіць намі, таксама нажывуць вялікія фартуны і дзяржава неяк вытрымае гэтае ярмо. Польшча сёння з'яўляецца амаль калёніяй Захаду: амаль усе фабрыкі распраданы чужому капіталу, а беспрацоўе далей будзе дамінаваць у нас.

А на каго я галасаваў? А вось: на жоўтай картцы аддаў я галасы на Яна Сычэўскага, Сяргея Плеву і на яшчэ аднаго, што прозвішча забыў. А на белай пад нумарам 4 аддаў я голас на Самаабарону А. Лепэра.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Свінская справа

2 кастрычніка г.г. вяртаўся я з Беластока цягнікам у Чаромху. Не даязджаючы да Бельска-Падляшскага перад чыгуначным пераездам на дарозе Бельск — Арэхавічы на абочыне пуці пад кустамі ўбачыў я праз акно падла. Яшчэ 5 кастрычніка падохлая свіння ляжала на гэтым самым месцы. Варта адзначыць, што падобнае бачу другі раз. У мінулым годзе хтосьці выкінуў падла пад елкі з процілеглага боку пуці амаль у тым жа месцы. Мне здаецца, што хтосьці наўмысна выкідае падла на абочыну і свядома атручвае асяроддзе. А мо б так бельская санэпідэмстанцыя пацікавілася справай і пахадайнічала за тым, каб знайсці віноўных і прыцягнуць іх да адказнасці? (ус)

Дары пацярпелым ад паводкі

Жыхары вёскі Райск Бельскай гміны сабралі 75 мяшкоў кармавога збожжа пацярпелым ад паводкі жыхарам Жуховай (Тарноўскі павет). Грузавік „Ельч" для перавязення дараў дала Суполка „Бельмлек" з Бельска-Падляшскага.

У Жухову грузавік завёз 3 кастрычніка г.г. таксама 100 мяшкоў з вопраткай, дзве пральныя машыны ды харчы. Адзенне збірала моладзь згуртаваная ў Таварыстве „Рай" у Бельску-Падляшскім. Ахвяравальнікамі адзення былі жыхары Бельска і Олі. (яц)

Аб'явы

Рэстаран „Toast" запрашае арганізаваць вяселлі. Тэл. 653 21 52; мабільнік: 0607 567 673.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 85) 743 50 22.
Internet: http://republika.pl/niva_bielastok/
E-mail: niva_bielastok@poczta.onet.pl

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Dziedzictwa Narodowego.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2002 r. upływa 5 grudnia 2001 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2002 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 84,00; pocztą lotniczą Europa — 96,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 120,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Towarowa 28, 00-958 Warszawa. Nr konta PBK S.A. XIII Oddział Warszawa 11101053-16551-2700-1-67.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,30 zł, a kwartalnie — 42,90 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,60 (kwartalnie — 59,80), pocztą lotniczą: Europa — 5,20 (67,60), Ameryka Płn., Afryka — 5,80 (75,40), Ameryka Płd., Środk., Azja — 6,40 (83,20), Australia — 8,20 (106,60). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Як не ведаць Вілу Журбу?

Прыемнай неспадзеўкай стала для нас анатацыя праф. А. Мальдзіса на беластоцкую „Правінцыю” ў элітных „Кантактах і дыялогах”. Насцярожыла нас толькі вестка, што прафесар не пазнаёміўся дагэтуль з наогул добра вядомай у беластоцкіх колах Вілай Журбой (пацвярджае гэта агульнае, на жаль, правіла, што кругагляд мінскай эліты абрываецца на межах горада).

Віла Журба (сапр. Віялета Панасюк) нарадзілася ў 1963 г. у Страблі на Беласточчыне; актуальна жыве ў Парыжы, дзе займаецца перакладамі з і на французскую ды англійскую мовы. Абыймо гэтай занатоўкі не дазваляе назваць увесь спектр перакладзеных ёю аўтараў. Скажам толькі, што В. Журба спрабавала таксама сілы ў мастацкім слове як аўтарка — яна выдала ў 1993 г. у Беластоку нізку сваіх вершаў „Ізамарфічнасць”, а пазней, жывучы ўжо ў Парыжы, супольна з С. Абухам выдала па-ангельску „Замбарскія матывы” („Zambarian Tunes”). (ам)

У "Провінцыі" – адмысловы подбор аўтараў: тыя з Беларусі, што жывуць не ў Мінску, і тыя з Беласточчыны, што, зрэшта, не жывуць у Варшаве: Мікола Вайцюнок, Сяргей Астроўцоў, Алесь Аркуш, Юры Гуменюк, Ян Максімюк, Вінцась Мудроў, Міра Лукша... У выніку даве "провінцыі" спорадзілі выданні, якім можа ганарыцца кожная сталіца. Зночыць, вось яшчэ "пора" у беларускіх провінцыях! Пра тое ж сведчыць і продуманы подбор аўтараў, высокі ўзровень перакладу ў раздзеле "Словы", дзе знешчаны творы Багуміла Грабала, Галіны Пасвятоўскай, Дылана Томаса і Патрыка Модыяно. Перакладчыкам тут выступае Віла Журба, особа для літаратурнага невядомая. Дай Божа, каб гэта быў яшчэ адзін "провінцыйны" талент!

А. М.

© „Кантакты і дыялогі”, № 7-8/2001

Колькі за што

Цяпер то добра жыць журналістам, асабліва палітычным аглядальнікам. Бо зарабіць можна на чужым горы. Уключыце ў любы час, калі весткі са свету перадаюць, тэлевізар ці радыё. Мне аж блага робіцца, калі гэтага слухаю. Як гончыя задыханыя сабакі лапочуць пра тое, куды, колькі, хто, каго... Урэшце штосьці дзеецца! Штосьці ўзрываецца, валіцца, прападаюць тысячы... Што там адзін труп, які час ад часу ажыўляе навіны! А чытачы ды слухачы аж заходзяцца. Не? Жахаюцца, перажываюць, трасуцца ад ляку ў сваіх каморках у сусветнай вёсцы. У яшчэ большую паніку ўвальваюцца. Нічога, што тое ўсё можа і далёка ад нас. Цяпер тутака націснеш кнопку, а тварыцца з таго боку, і наадварот. Іншых пісакаў турбуе якраз тое, колькі зарабляюць тыя, што да вайны маюць дачыненне. Сам чуў. Праўда, па піўцу невялікім былі тыя звычайныя журналісты газетныя. Найбольш злаваліся, што ўсе тыя інфармацыі ў іхныя дзённікі бяруцца з прэс-агенцтваў, а пра іхнюю зас...ую апінію ніхто ў іх не пытаўся. Пэўна, мог бы нейкі А. ці Б. выказацца, што ён думае пра агрэсараў ці іншых тэрарыстаў, але нуль гэта абыходзіць будзе любога чытача. Ну, хіба што знойдзе такі ваяводскі ці павятовы слоўны стратэг ці тактык якога недабітага або ягоную сям'ю, і будзе эксплуатаваць тэму да дошчачкі. Ды хай яму тыя грошы бокам не вылезуць. А газетная папера пэцкае пальцы (сучасна, здаецца, толькі „Współczesna”).

— Дам табе што хочаш, — заглянула мне ў вочы мая жонка. — І накармлю, і напаю, і прытулю.

— Ды за што? — запытаўся я ў мае Агаты. Даўно гэтак мяне не турбавала. Ну, вядома, карміла, паіла, прытуляла, ды не было між намі гэткіх камерцыйных праблем. Ну, за што? За тое, што яе кахаю? Што лепш прыязна да сябе адносіцца, калі пару дзесяткаў гадоў абіваем аб сябе клубы ў адной хаце? Кожны мае свой куточак улюбёны, але неяк жа ж трэба жыць, калі і шляхі перасякаюцца, і інтарэсы бываюць адрозныя. Хочацца разок кінуць слоўную бомбачку, а часам і шпурнеш штось зусім мала дыпламатычнае. Дараваць мусова. Было ні было, хата ж адна, жыццё адно. Ну, але чаго ж то хоча ад мяне сёння мая прыгожая палова?

— Ну? — я запытальна ўзняў свае пышныя бровы; яны заўсёды рабілі на кабетах уражанне.

— Гэта пасля.

— Пасля чаго?..

— Вандаліку, вось якая справа... Хочам у нас зрабіць бабскую канферэнцыю... На тэму бяспекі... У нашай з табой кватэры.

— То ты, Агатка, адразу кажы, што напіцца хочаш кавы ці там чаго яшчэ.

— Та ўжэ ж, я табе скажу, што кабеты любяць піць. Кажу, бяспека.

— Бы я не ведаў. Ды чаму мяне з хаты выганяеш? Я ж кабет разумею. А тая бяспека, то, разумею, датычыць мужыкоў? Таму мне выпадае бадзяцца па горадзе, калі вы тут нараду нейкую мець будзеце, га?

— Вандал, ідзі куды хочаш. Нават і ў піўнушку. Выключаю тэлевізар, тэлефон, радыё.

Я пайшоў з хаты. А ў піўбары, дзе я заказаў кубак кавы, працавалі адразу і тэлевізар, і радыё, і званілі мабільныя тэлефоны, а павятова-гмінныя пісакі разважалі пра восень і вайну. О, к..!

Вандал Арлянскі

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Мікалай застае жонку ў абдымках каханка. Яна спакойна тлумачыць узбуранаму мужу:

— Гэта не каханак, а спонсар. І не прастытуцыя, толькі бізнес.

* * *

— Чым розніцца карчма ад будоўлі?

— У карчме штораз больш людзей.

* * *

— Марыся, я чула, што ты стала працаваць у бюро.

— Так, бо дома няма тэлефона.

* * *

— Ці Казік казаў табе, што я была яго першай жонкай?

— Так, але агулам...

— А як?

— Калісь згадваў, што ў маладосці зрабіў некалькі дурнот.

* * *

— Аня, ці гэта праўда, што ў цябе двух каханкаў?

— Толькі адзін. Другі, гэта мой нарачоны.

* * *

— Якая розніца між тэлевізарам і жонкай?

— Тэлевізар можна выключыць, а на жонку мус бесперапынна глядзець і бесперапынна яе слухаць.

* * *

— Верачка! Твой муж выглядае цудоўна ў гэтым новым касцюме.

— Гэта не новы касцюм. Гэта новы муж!

* * *

— Здароў, Янка! Як жывеш?

— Цудоўна. Сёння адкрыў ювелірную краму.

— Як гэта?

— Так, як і ўсе — адмычкай.

* * *

— Каханы! Не гаварыла табе гэтага раней, але цяпер ведаю напэўна: хутка будзе нас траіх!

— Гэта цудоўна! А ці ты ўпэўненая?

— Безумоўна! Вось паглядзі тэлеграму: заўтра прыязджае мая мамачка.

* * *

У турбазу заходзяць турысты:

— Ёсць нешта перакусіць?

— Няма.

— А кіпень?

— Ёсць, але ўжо халодны.

* * *

Дырэктар да сакратаркі:

— Хто табе дазволіў працаваць так, як табе падабаецца толькі пасля таго, калі я некалькі разоў пацалаваў цябе?

— Мой адвакат.

* * *

— Пан дырэктар, — скардзіцца сакратарка, — калі я сядзела ў бюро, падышоў бухгалтар і пацалаваў мяне!..

— Вельмі мне прыкра, але наша прадпрыемства такое вялікае, што я не ў змозе зрабіць усё сам.

* * *

Размаўляюць дзве бландзінкі:

— Ці ты атрымала мой ліст?

— Той, у якім дамагаешся звароту грошай?

— Так.

— Не, не атрымала.

Двухлітарная крыжаванка



Гарызантальна: 1. горад на ўсходзе Зімбабве, 3. любімая расліна каларадскага жучка, 5. біржавы пасрэднік, 7. упакоўка, 9. млынавы выраб, 10. расійскі горад над верхнім Кубанем, 11. прыродная сыравіна са злучэннямі металаў, 12. выспа ў Алеутскіх астравах, 14. роў для сцёку вады, 16. іспанская правінцыя з Памплонай, 17. мясцовасць у Чэхіі каля Градца-Кралове, дзе ў 1866 годзе прускія войскі перамаглі аўстрыйцаў і саксонцаў.

Вертыкальна: 1. паўднёваафрыканскі горад на паўднёва-усходнім схіле Драконавых гор, калісь цэнтр бантуштата Транскей, 2. сталіца Пэру, 3. лёгкая лодка з парусам для катання на лёдзе, 4. невялікая акругленая лячэбная шкляначка для прыліву крыві да скуры, 6. маслінавая расліна сямейства малачаевых, 8. шлях зносін уздоўж лініі фронту, 9. салодкае вінаграднае віно, 11. кансерватызм, застой, 13. сцябліна, саломіна, асобная расліна, 14. вынік судовага разбору злачынства, 15. фінскі порт над Батнічным залівам.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 36 нумара

Гарызантальна: абак, валюш, „Аберон”, трус, жолаб, асліца, варэнікі, Дакар, каўказка, Румянцаў, Лхаса, індыянка, млынар, Арура, Эпір, закрой, сівак, квач.

Вертыкальна: Сафона, Любава, Бурдэнка, Касаі, кеглі, сонца, бараніна, скакалка, Дору, Камю, язва, Наса, аўсяніца, Харбін, Сернан, алмаз, Інары, Дрэйк.

Рашэнне: **Ссякаючы дрэва, забіваеш песню** (Алесь Барскі).

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Вользе Дземяновіч** з Варшавы і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

ISSN 0546-1960